Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

23 СТУДЗЕНЯ 2015 г. ПЯТНІЦА № 13 (27871) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



## Спадчына майстра Тарасюка

СТАР. 13



## Праграма тэлебачання на наступны тыдзень

**20 КАНАЛАЎ**

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Пётр МІКЛАШЭВІЧ, старшыня Канстытуцыйнага суда:**

*«Канстытуцыйны суд падкрэслівае, што ўсе грамадзяне краіны павінны выконваць законы і канстытуцыйныя абавязкі. Адным з іх з'яўляецца выплата падаткаў кожным грамадзянінам нашай краіны. Гэтыя сродкі ідуць на агульнае дабро, на рост дабрабыту народа. Дзяржава аказвае ўсялякую дапамогу грамадзянам краіны ў сферы медыцыны, адукацыі. Праблема ў тым, што некаторыя з іх не выплачваюць пэўныя падаткі, але карыстаюцца тымі выгодамі, якія існуюць на сродкі ўсіх падаткаплацельшчыкаў. Мэта распрацоўваемага нарматыўна-прававога акта грунтуецца на канстытуцыйных палажэннях. Усе павінны выконваць канстытуцыйныя абавязкі і ўдзельнічаць у стварэнні агульнага дабра».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 23.01.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 14890,00 | ▼ |
| Еўра | 17250,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 227,50 | ▼ |
| Укр. грыўня | 940,03 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# Па ўдачу



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Жыхар гарадскога пасёлка Асвея ідзе на самае паўночнае беларускае возера на зімовую рыбалку.

■ Надвор'е

## РЫХТУЙЦЕ НАСОЎКІ

### А крыху падмарозіць толькі на наступным тыдні

**Сёння тэрыторыя нашай краіны застанецца пад уплывам цёплых паветраных мас, якія рухаюцца да нас з боку паўднёвага захаду Еўропы, паведаміла спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА. Таму ў многіх раёнах пройдуць апалкі (мокры снег і дождж), чакаецца туман, а месцамі — галалёд і наліпанне мокрага снегу. На асобных участках дарог галалёдзіца.**

Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе ад нуля да плюс 4 градусаў. У суботу і нядзелю наступны атмасферны фронт прыцягне да нас чарговую порцыю вільгаці і цяпла. Амаль паўсюдна пройдуць мокры снег і дождж. Месцамі туман і галалёдныя з'явы. Тэмпература паветра на працягу сутак у гэтыя два дні будзе вагацца ад мінус 3 да плюс 4 градусаў. Толькі ўначы на нядзелю па ўсходзе краіны пры праясненнях тэмпература паветра знізіцца да мінус 4-7 градусаў.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных спецыялістаў, у пачатку наступнага тыдня чакаецца невялікае пахаладанне. У панядзелак пачне павялічвацца атмасферны ціск і месцамі пройдзе кароткачасовы снег. На дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы на панядзелак ад 0 да мінус 7 градусаў, пры праясненнях — да 9 марозу. Удзень — ад мінус 5 да плюс 1 градуса. Сіноптыкі прагназуюць, што да серады ўключна ў нас часам будзе ісці снег. Тэмпература паветра ўначы складзе ад 1 да 7 марозу, пры праясненнях — да мінус 8-12 градусаў. Удзень чакаецца ад мінус 5 да плюс 1 градуса.

**Сяргей КУРКАЧ**

*У сувязі з пагаршэннем умоў надвор'я адбыўся невялікі ўсплёск аварыйнасці на дарогах. За мінулыя суткі ў сталіцы, напрыклад, было зарэгістравана 122 дарожна-транспартныя здарэнні, што прыкладна на 20 больш, чым у іншыя дні. У трох аварыях тры чалавекі атрымалі раненні, паведамілі ва УДАІ ГУУС Мінгарвыканкама.*

*Дзяржаўтаінспекцыя просіць грамадзян па магчымасці адмовіцца ад выкарыстання асабістага аўтатранспарту ў сувязі з неспрыяльным надвор'ем. Калі не выходзіць, быць вельмі ўважлівымі і асцярожнымі за рулём, захоўваць бяспечную дыстанцыю і правілы праезду пешаходных пераходаў. На некаторых участках хуткасць транспартнага патоку можа складаць 30 кіламетраў у гадзіну. Неабходна пазбягаць рэзкіх тармажэнняў. Пешаходам таксама варта праявіць павышаную ўвагу. Пераходзіць дарогу толькі ва ўстаноўленым месцы, у цёмны час сутак абазначаць сябе святлоадбівальнымі элементамі.*

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## НА ПРАМОЙ ЛІНІІ — МІНІСТР КУЛЬТУРЫ

Кожны чытач «Звязды», грамадзянін, беларус — увогуле чалавек мае дачыненне да пытанняў культуры. За якой стаяць і міжчалавечыя адносіны, і захаванне нацыянальнай спадчыны, і новыя пастаноўкі ў тэатрах, і сучаснае кіно, і літаратурныя тэндэнцыі... Культура — гэта аснова развіцця, станаўлення асобы, нашай будучыні.

Па якой сістэме, у якіх напрамках павінна развівацца беларуская культура з усімі яе складнікамі, чытачам «Звязды» раскажа **міністр культуры Барыс Уладзіміравіч СВЯТЛОЎ** падчас прамой лініі, якая адбудзецца ў рэдакцыі газеты «Звязда» **30 студзеня**. Дакладны час будзе вядомы пазней.

***Папярэдне свае пытанні дасылайце на электронны адрас (info@zvyazda.minsk.by з пазнакай «Прамая лінія») ці тэлефануйце па нумары: 287-18-51.***

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

## Адгуляўшы Каляду, падпішыся на «Звязду»!

**Вы аформілі падпіску на першы квартал ці нават на паўгоддзе? Тады гэты напамін не для вас.**

**А вось тым, хто падпісаўся на газету толькі на студзень, нагадваем: не забудзьцеся прадоўжыць падпіску на люты, сакавік і наступныя месяцы! Зрабіць гэта можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі, з дапамогай аплатна-даведачнага тэрмінала «Белпошта», праз сістэму «інтэрнэт-падпіска» на сайце www.belpost.by альбо ў вашага паштальёна да 27 студзеня.**

**У кіёсках і крамах «Белсаюздрука» — да 23 студзеня.**

***Пра тое, што сапраўды важна, чытайце па-беларуску!***

# АДЫСЦІ АД КАБІНЕТНАГА СТЫЛЮ РАБОТЫ

**Прэзідэнт арыентуе ўрад на захаванне дасягнутай па выніках 2014 года тэндэнцыі перавагі ў росце прадукцыйнасці працы над зарплатай.**
**Такую задачу кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка паставіў, прымаючы ўчора з дакладам прэм'ер-міністра краіны Андрэя Кабякова, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу Андрэя Кабякова на неабходнасць адыходу ад кабінетнага стылю работы і канцэнтрацыі на матэрыяльнай вытворчасці і нарошчванні экспарту. «Вакол гэтага мы будзем страіць усю работу», — падкрэсліў Прэзідэнт. Кіраўнік дзяржавы таксама адзначыў, што мае намер захаваць такую форму работы, калі на ўзроўні Прэзідэнта разглядаюцца 2-3 вострыя праблемныя эканамічныя пытанні.

Прэм'ер-міністр далажыў аб папярэдніх выніках работы эканомікі ў 2014 годзе. Так, паводле яго слоў, тэмп росту ВУП склаў 101,6 працэнта. Ён са шкадаваннем заўважыў, што гэта менш за абазначанае прагнозам (103,3 працэнта), аднак крыху вышэй, чым у суседзяў. «У цэлым сітуацыя няпростая, і тэмпы росту эканомікі, якія склаліся, не маглі б нас задавальваць, калі б не тая сітуацыя, якая складваецца цяпер на знешніх рынках», — сказаў Андрэй Кабякоў. Ён адзначыў, што ў Беларусі выкананы прагноз па сальда знешнеэканамічнай дзейнасці. Пры прагнозе 0,1 працэнта ад ВУП папярэдняе сальда складае каля $600 млн па метадалогіі плацежнага балансу Нацбанка.

Паводле слоў прэм'ер-міністра, 6 рэгіёнаў краіны, за выключэннем Магілёўскай вобласці, прадэманстравалі рост валавога рэгіянальнага прадукту. Пры гэтым Віцебская, Гродзенская і Мінская вобласці выканалі прагнозныя паказчыкі. Ёсць пэўны рост і прамысловай вытворчасці — на 1,9 працэнта. Як адзначыў кіраўнік урада, у многім гэта звязана з актывізацыяй работы калійнай вытворчасці, апрацоўчай прамысловасці, а таксама дзякуючы прынятым мерам па дыверсіфікацыі паставак на знешнія рынкі. У пэўнай частцы назіраецца павелічэнне паставак на ўнутраны рынак — тэмп росту 100,4 працэнта.

Прэм'ер-міністр звярнуў увагу на тое, што адчувальны эфект далі тыя галіны, у якіх была праведзена мадэрнізацыя, у прыватнасці дрэваапрацоўка, цэлюлозна-папяровая галіна, хімічная прамысловасць. Што датычыцца складскіх запасаў, то па выніках года яны склалі 75,8 працэнта ад аб'ёму прамысловай вытворчасці, што вышэй, чым запланавана. Тым не менш на пачатак года складскія запасы гатовай прадукцыі зніжаны на $1,3 млрд, што, на думку прэм'ер-міністра, таксама з'яўляецца некаторым вынікам.

Таксама падчас сустрэчы закраналася тэма размеркавання арэнднага жылля. Выключэнняў у правілах яго размеркавання не будзе, падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. «Мы прынялі рашэнне па арэндным жыллі. У гэтым напрамку павінны дзейнічаць», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

«Правілы змяняць ні ў якім разе нельга. Ніякіх аддушын, нікому нічога не перадаваць на больш ільготных умовах. Або дапаўняць спісы атрымальнікаў гэтых кватэр тымі, хто туды не трапіў, — гэтага быць не павінна! Ніякіх не павінна быць выключэнняў! Роўныя ўмовы», — падкрэсліў Прэзідэнт. Ён адзначыў, што пры размеркаванні арэнднага жылля трэба дзейнічаць на агульных падставах. Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, калі жыллё застаецца незапатрабаваным, то трэба думаць загадзя, перш чым будаваць. Аляксандр Лукашэнка закрануў пытанне продажу легкавых аўтамабіляў Geely. «У гэтай частцы хачу сказаць наступнае: мы, безумоўна, можам стымуляваць і продаж легкавых аўтамабіляў, і яшчэ нечага можам, калі ў выніку ў недалёкай будучыні, праз месяц, два ці паўгода гэта дасць нам большы эфект для бюджэту, для дзяржавы. Усё астатняе нас не павінна цікавіць. Той, хто хоча купіць аўтамабіль, той яго купіць», — сказаў Прэзідэнт.

«Не час сёння займацца падачкамі, ільгатаваннем, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Калі будзе выгада для дзяржавы, то мы гатовы падставіць плячо тым, хто хоча набыць аўтамабіль. Іншых правіл быць не павінна. Таму што мы зноў пачнём адным даваць, іншым не даваць, некага пакрыўдзім, некага не пакрыўдзім — для ўсіх павінны быць роўныя ўмовы».

# САЦЫЯЛЬНЫЯ ПЫТАННІ — НА ПЕРШЫМ ПЛАНЕ

## Прэзідэнт звяртае асаблівую ўвагу на недапушчэнне неабгрунтаванага росту цэн

**Аляксандр Лукашэнка прыняў з дакладам старшыню Камітэта дзяржаўнага кантролю Леаніда Анфімава, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.**

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што хацеў бы абмеркаваць праблемныя пытанні, якімі займаецца КДК. Прэзідэнт падкрэсліў, што плануе асабіста наведаць камітэт. Ён растлумачыў, што часта сустракаецца з парламентарыямі, але радзей бывае ў такіх структурах, як КДК, Вярхоўны суд. «З мяне ніхто не здымаў адказнасці за каардынацыю дзейнасці галін улады і тым больш адпаведных дзяржаўных органаў, асабліва Камітэта дзяржкантролю. Таму мы знойдзем такую форму работы, каб я мог і паглядзець, і паслухаць аб выніках працы за мінулы год, маючы на ўвазе перспектывы дзейнасці камітэта», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

«Не трэба ніякіх справаздач, давайце разгледзім тыя праблемы, якія існуюць, і пытанні, якія знаходзяцца на кантролі ў КДК. Асабліва сацыяльна гучныя пытанні, у прыватнасці, аб выніках работы камітэта па праблемных жылых дамах, гэта вельмі важнае пытанне, як яно вырашаецца? А таксама тэма землекарыстання — што ў нас тут за праблемы?» — пацікавіўся кіраўнік дзяржавы. У сувязі з гэтым ён нагадаў аб патрабаванні ўзвядзення грамадзянамі дамоў на выдзеленых для гэтых мэтаў участках на працягу трох гадоў.

Акрамя таго, Прэзідэнт звярнуў асаблівую ўвагу на кантроль за неабгрунтаваным ростам цэн у краіне: «Тут нам трэба працаваць так, каб асобных гандлёвых сетках не жыравалі на праблемах людзей, але і так, каб не загубіць бізнес. Наколькі Камітэт дзяржкантролю ўцягнуты ў падобныя мерапрыемствы, і якія ў вас адчуванні ў сувязі з гэтым? Самае галоўнае — не загубіць бізнес і не дапусціць неабгрунтаванага росту цэн. Таму што для гэтага ніякіх падстаў няма. Калі ўвесь свет у крызісе, асабліва постсавецкая прастора, неабходна разумець, што трэба і нашаму бізнесу некалькі зменшыць апетыты. Я не кажу, каб зусім зацягнуць паясы, але гэты час трэба перажыць разам з народам».

Леанід Анфімаў расказаў аб дзейнасці міжведамаснай працоўнай групы, якая была створана ў снежні і практычна штодня адсочвала сітуацыю на спажывецкім і валютным рынках да таго часу, пакуль становішча спраў адносна не стабілізавалася. Ён адзначыў, што цяпер няма ніякай неабходнасці для ўмяшання ў гэтыя пытанні КДК, паколькі склалася адносная раўнавага на спажывецкім і валютным рынках. «Мы проста адсочваем становішча спраў, каб адрэагаваць, калі будуць узнікаць нейкія надзвычайныя сітуацыі», — сказаў Леанід Анфімаў.

На сустрэчы размова ішла таксама аб пытаннях гідраэнергетыкі і ходзе выканання даручэнняў, дадзеных раней кіраўніком дзяржавы ў розных сферах.

# НОВЫЯ ЧЛЕНЫ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ

У адпаведнасці з часткай другой артыкула 91 Канстытуцыі Беларусі кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка назначыў членамі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу пятага склікання Уладзіміра Даманеўскага (старшыню Магілёўскага аблвыканкама), Анатоля Ліса (старшыню Брэсцкага аблвыканкама), Мікалая Шарстнёва (старшыню Віцебскага аблвыканкама). Як паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе Прэзідэнта, адпаведныя ўказы Аляксандр Лукашэнка падпісаў 22 студзеня.

■ Гандаль

# З НАЦЫЯНАЛЬНЫМ КАЛАРЫТАМ І НЯДОРАГА

## А яшчэ кааператары актыўна развіваюць айчынны брэнд «Каралеўства футра»

**Спажывецкі гандаль павінен захоўваць даступныя для пакупнікоў цэны. Пра гэта заявіў намеснік прэм'ер-міністра Міхаіл РУСЫ на пашыраным пасяджэнні праўлення Беларускага рэспубліканскага саюза спажывецкіх таварыстваў, дзе разглядаліся вынікі працы спажыўкааперацыі за мінулы год.**

### НЕ КАНКУРЭНТЫ, А САЮЗНІКІ

Віцэ-прэм'ер адзначыў, што ў бліжэйшы час урад плануе правесці нараду з буйнымі сеткавікамі, дзе будзе распрацавана стратэгія і тактыка працы на спажывецкім рынку. Галоўным напрамкам працы і трэндам краіны сёння павінна стаць захаванне даступных цэн. Дзеля гэтага трэба шукаць крыніцы і магчымасці зніжэння сабекошту прадукцыі.

Асобна намеснік прэм'ер-міністра звярнуў увагу на пашырэнне асартыменту тавараў. Гэта павінны быць не толькі кансервы ў слоіках, бо людзі ўжо прывыклі да свежай агародніны і садавіны; таксама існуе ўстойлівы попыт на традыцыйныя саленні і квашанні. «Аднак у крамах Мінска цяпер няма ўсяго асартыменту, які выпускае спажыўкааперацыя», — адзначыў Міхаіл Русы і прапанаваў Белкаапсаюзу пастаўляць прадукцыю ўласнай вытворчасці ў сеткавыя крамы. На яго погляд, у гэтым пытанні гандлёвыя сеткі не канкурэнты, а саюзнікі. На сталічных паліцах таксама павінен быць тавар перапрацоўчых прадпрыемстваў Белкаапсаюза. У першую чаргу неабходна наладзіць перапрацоўку і продаж ягад і грыбоў, якія цяпер запатрабаваны ў насельніцтва.

Гаворачы пра вынікі працы Белкаапсаюза летась, Міхаіл Русы адзначыў, што за апошнія два гады зроблены рэальны крок наперад па многіх напрамках. У працы тут захоўваецца і сацыяльная накіраванасць. У прыватнасці, у насельніцтва набываюцца лішкі сельгаспрадукцыі, якія потым перапрацоўваюцца і пастаўляюцца як гатовая прадукцыя ў крамы і на экспарт. «Па гэтым напрамку Белкаапсаюз працуе няд рэнна», — упэўнены віцэ-прэм'ер. Ён параіў спажыўкааперацыі больш актыўна ўключацца ў барацьбу за пакупніка.

### ПЛЮС 26 БУЙНЫХ МАГАЗІНАЎ І 140 НОВЫХ АЎТАКРАМ

Сукупны аб'ём дзейнасці сістэмы спажывецкай кааперацыі летась перавысіў 28,8 трл рублёў, паведаміў на пасяджэнні **старшыня праўлення Белкаапсаюза Валерый ІВАНОЎ**.

Ён адзначыў, што летась уведзены ў эксплуатацыю 26 крам гандлёвай плошчай 500 квадратных метраў і больш. Адкрыта 78 магазінаў крокавай даступнасці і 37 спецыялізаваных магазінаў нехарчовых тавараў. Сёння аўтакрамы спажыўкааперацыі абслугоўваюць усе населеныя пункты ў сельскай мясцовасці, дзе адсутнічае стацыянарная гандлёвая сетка. «Кіраўнік дзяржавы даваў нам адпаведнае даручэнне, і яно выканана. Для гэтага ў 2014 годзе было дадаткова закуплена 140 новых аўтакрам», — адзначыў кіраўнік Белкаапсаюза. Такім чынам, аўтакрамы абслугоўваюць жыхароў 13,9 тысячы сельскіх населеных пунктаў, пры гэтым прыкладна ў 4 тысячах вёсак пражываюць менш чым па 10 чалавек. Магазіны на колах дастаўляюць тавары і туды тройчы на тыдзень.

### ОПТАМ ТАННЕЙ

Летась увесну ў сістэме Белкаапсаюза пачаў дзейнічаць адзіны аптова-лагістычны цэнтр, які спецыялізуецца на пастаўках харчовых тавараў крытычнага імпарту і нехарчовых тавараў айчынных вытворцаў. Як адзначыў Валерый Іваноў, яго стварэнне дазволіла зрабіць таннейшым і тым самым істотна павялічыць рэалізацыю некаторых груп тавараў, у прыватнасці, садавіны (у 8 разоў), рыбы (у 3,5 раза), круп (у 2,5 раза). У бліжэйшы час рэгіянальныя прадстаўніцтвы аптова-лагістычнага цэнтра з'явяцца ва ўсіх абласцях краіны.

### ПА ХАТНІХ РЭЦЭПТАХ

У грамадскім харчаванні летась было ўведзена ў эксплуатацыю 40 аб'ектаў і мадэрнізавана 20 дзейных пунктаў прыдарожнага сэрвісу. Сёлета ў 32 райпа і ў 2 унітарных прадпрыемствах Белкаапсаюза арганізавана вытворчасць паўфабрыкатаў, гатовай кулінарнай прадукцыі і кандытарскіх вырабаў з прымяненнем тэхналогіі шокавай замарозкі. Летась было набыта і ўсталявана 8 апаратаў для такой замарозкі.

Валерый Іваноў адзначыў, што ў прамысловай галіне спажывецкай кааперацыі за мінулы год мадэрнізавана 20 прадпрыемстваў, у тым ліку 10 хлебапякарных, 6 мясаперапрацоўчых і 2 рыбаперапрацоўчыя цэхі. Метадамі салення, квашання і мачэння ў цэлым па Белкаапсаюзе перапрацавана 4,1 тысячы тон сыравіны, што на 36% больш, чым год таму. Выраблены 1584 тоны мяснай прадукцыі па нацыянальных «хатніх» рэцэптах (тэмпам росту 117%). У цэлым па Белкаапсаюзе выраблена прамысловай прадукцыі на 2,3 трлн рублёў.



Фота БЕЛТА.

### МАЕМ НОРКУ І ПЯСЦА

У сістэме дзейнічае 6 зверагаспадарак, якія вырошчваюць норак, пясцоў і ліс. Наладжана ўласная перапрацоўка пушніны і выпуск гатовых вырабаў з айчыннай сыравіны. У рэспубліканскіх аб'ёмах вытворчасці пушніны Белкаапсаюз займае вядучае месца (больш за 90% шкурак пушных звяроў). Летась зверагадоўчыя арганізацыі спажыўкааперацыі вырабілі больш за 940 тысяч скурак клеткавых пушных звяроў.

Унітарным прадпрыемствам «Белкаапзнешгандаль Белкаапсаюза» летась на ўнутраны рынак краіны адгружана вырабаў з футра на суму 14,8 млрд рублёў. Усяго было выраблена 21 тысяча шкурак пушных звяроў, выпушчана 2710 гатовых вырабаў, у тым ліку 626 адзінак вопраткі, што ў 2 разы больш за адпаведны ўзровень мінулага года.

Менавіта ў апошні час Белкаапсаюзам актывізуюцца распрацоўкі па стварэнні ўласнай сеткі фірменнага гандлю футравымі вырабамі пад брэндам «Каралеўства футра». Дзеля гэтага летась у кастрычніку ў Мінску адкрыты спецыялізаваны магазін, такая ж крама дзейнічае ў Брэсце, а ў снежні мінулага года праведзены гала-паказ, прысвечаны адкрыццю новага салона-крамы ў цэнтры сталіцы. Сёлета ў гандлёвых аб'ектах Белкаапсаюза, размешчаных у райцэнтрах і буйных гарадах, плануецца адкрыць яшчэ 23 секцыі па рэалізацыі выраблянай пушніны і 7 секцый па гандлі вырабамі з натуральнага футра.

**Сяргей КУРКАЧ**

■ Блізкая ўлада

Сямён ШАПІРА:

# «КОШТ КВАДРАТНАГА МЕТРА ЖЫЛЛЯ Ў НОВАБУДОЎЛЯХ БУДЗЕ ПРАВЕРАНЫ»

**Падчас апошняй «прамой лініі» старшыня Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Сямён Шапіра прыняў 14 званкоў. Людзі звярталіся па самых розных пытаннях. У прыватнасці, механізатар з Мядзельскага раёна, які працуе ў райаграсэрвісе, скардзіўся на заробак. «Як на такія грошы пракарміць сям'ю: жонку і дваіх дзяцей?», — пытаўся мужчына. На яго думку, расцэнкі па аплаце працы не адпавядаюць сапраўдным. Разам з тым у кіраўніка арганізацыі зарплата ў некалькі разоў вышэйшая, чым у простых працаўнікоў. Старшыня аблвыканкама даў даручэнне адпаведным службам праверыць сістэму аплаты працы не толькі ў спецыялістаў сельгаспрадпрыемства, але і ў кіраўніка.**

Камбайнер Максім Ціуновіч з ААТ «Селеўцы» Маладзечанскага раёна разам з бацькам працавалі на жніве. За добрую працу ім уручылі грамату, але да гэтага часу экіпаж не дачакаўся прэміі, якая яму належыць.Сямён Шапіра пацікавіўся ўмовамі працы, асабістым жыццём хлопца. У адказ пачуў, што шчыравалі яны з бацькам на камбайне «Клаас», намалацілі 1800 тон збожжа. Як лічыць Максім, калі б камбайн быў «не такім маленькім», то і вынікі былі б больш важкімі. Падзяліўся хлопец і прыемнай навіной: ён жэніцца. З ім Максіма Мікалаевіча і павіншаваў кіраўнік Міншчыны. Прэмію экіпаж камбайна атрымае, і яна будзе якраз дарэчы перад вяселлем. А вось што тычыцца просьбы аб новым камбайне, то тут губернатар сказаў літаральна наступнае: «Калі хлопец сапраўды добры працаўнік, то варта разгледзець пытанне аб яго выдзяленні».


Фота БЕЛТА.

Марыя Сямёнаўна з Любані паскардзілася на адсутнасць у доме гарачай вады. Сямён Шапіра сказаў, што нядаўна ён наведваў райцэнтр і ведае пра гэтую праблему: прыкладна 360 сем'яў знаходзяцца ў такой сітуацыі. Але каб забяспечыць усіх гарачай вадой, трэба дадаткова пракладваць інжынерныя камунікацыі. Зімой гэта зрабіць складана. А вось да наступнага ацяпляльнага сезона вада ў спажыўцоў будзе.

Уладзімір Анатольевіч з Маладзечанскага раёна расказаў, што ў іх вёсцы пяць гадоў таму закрылі магазін. У населены пункт ходзіць аўтакрама. Але жыхарам хацелася б мець стацыянарны гандлёвы пункт. Губернатар патлумачыў, што крамы ў сельскай мясцовасці закрываюцца па прычыне іх непрыбытковасці. Будынак трэба ўтрымліваць, забяспечваць ацяпленнем, плаціць за камунальныя паслугі, заработную плату прадаўцу. І тут перш за ўсё трэба пралічваць эканамічную мэтазгоднасць. Пенсіянер застаўся незадаволены, паабяцаў паскардзіцца ў вышэйшыя арганізацыі.

А вось маці з Барысава знайшла паразуменне са старшынёй аблвыканкама. Прадпрыемства затрымлівае ёй аліменты. Чатыры мільёны рублёў, вядома ж, для жанчыны, якая выхоўвае дзяцей, — грошы немалыя. Ды і справа не толькі ў гэтым. Аліменты ёй належаць па законе. А закон павінен выконвацца.

Сяргей Канстанцінавіч з Дзяржынска цікавіўся, чаму ў доме, які будуецца, значна павялічыўся кошт квадратнага метра жылля. Сямён Шапіра даручыў разабрацца ў сітуацыі. Разам з тым ён паведаміў, што кошт «квадрата» будзе правераны кантрольнымі органамі і ў іншых новабудоўлях. Магчыма, для павышэння цаны існуюць аб'ектыўныя прычыны. Напрыклад, праведзены нейкія дадатковыя работы. Калі сродкі адпавядаюць затратам на будаўніцтва, то неабходную суму ўсё ж трэба заплаціць.

Алена Пятроўна з Вілейкі патэлефанавала наконт рамонту дарогі. Сямён Шапіра нагадаў, што ў раённых газетах па яго даручэнні рэгулярна публікуецца графікі рамонту дарог, вуліц, пад'ездаў. У першую чаргу сродкі будуць накіроўвацца туды, дзе самая складаная сітуацыя. «Калі мы пачнём дапамагаць тым, хто дазваніўся да старшыні аблвыканкама, то гэта будзе няправільна ў дачыненні людзей, якія не змаглі гэтага зрабіць ці трапіць на прыём з такой жа просьбай», — сказаў губернатар.

Летась у Мінскім абласным выканаўчым камітэце прайшло 500 «прамых ліній». З графікам іх правядзення ў першым квартале гэтага года можна азнаёміцца на сайце Мінаблвыканкама. Як паказвае практыка, форма такіх зносін з прадстаўнікамі абласной улады вельмі запатрабаваная сярод жыхароў цэнтральнага рэгіёна. Напрыклад, толькі 17 студзеня на «прамую лінію» паступіла больш як 30 званкоў, усяго ж грамадзяне спрабавалі дазваніцца 21 тыс. разоў.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ** ■

■ Сітуацыя

## У РЭСТАРАНЕ «ХУТКА» НЕ ПАВІННА АЗНАЧАЦЬ «НЯЯКАСНА»

**Услед за шматлікімі за апошні час фактамі часовага спынення дзейнасці некаторых крамаў па ўсёй краіне праз парушэнні заканадаўства ў гэты сумны спіс патрапілі два рэстараны хуткага абслугоўвання «Гудзіс».**

Міністэрства гандлю закрыла іх на сем дзён — менавіта столькі адведзена на выпраўленне выяўленых хібаў. Сярод парушэнняў — няправільныя тэмпературныя ўмовы пры захоўванні паўфабрыкатаў, адсутнасць неабходнага абсталявання і рыштунку, якія б забяспечвалі іх якасць. Праверкі засведчылі адсутнасць дакладнай інфармацыі пра тавар, фармальны кантроль якасці і бяспекі прадукцыі, вельмі вузкі асартымент тавараў айчынных вытворцаў, а таксама прапанову да продажу пратэрмінаваных тавараў і страў.

**Сяргей РАСОЛЬКА** ■

■ Наш фармат

# ЭСТАФЕТА ПАДАРУНКАЎ

## Адрасатамі сёлетняй рэспубліканскай акцыі «Нашы дзеці» сталі каля 950 тысяч маленькіх грамадзян

**Звыш 7000 разнастайных святочных мерапрыемстваў адбылося ў краіне ў снежні 2014—студзені 2015 года ў межах традыцыйнай рэспубліканскай дабрачыннай акцыі «Нашы дзеці». На іх правядзенне і набыццё падарункаў дзецям выдаткавана ў сукупнасці 29,2 мільярда беларускіх рублёў (на 6 мільярдаў больш, чым летась).**

У дабрачынным марафоне, адзначыў намеснік міністра адукацыі Беларусі Віктар Якжык, не менш актыўна, чым у мінулыя гады, прынялі ўдзел самыя розныя арганізацыі і ведамствы, прадстаўнікі органаў мясцовай і рэспубліканскай улады, вядучых вытворчых прадпрыемстваў, устаноў банкаўскай сістэмы, грамадскіх арганізацый. Па-ранейшаму адгукаюцца на патрэбы дзяцей, якія апынуліся ў складанай жыццёвай сітуацыі, і простыя грамадзяне — неабыякавыя беларусы тэлефанавалі на «гарачую лінію», каб даведацца, дзе і якая канкрэтна дапамога патрэбна, а таксама перадавалі, у тым ліку ананімна, падарункі і патрэбныя рэчы ў дзіцячыя дамы і сацыяльныя прытулкі ва ўсіх рэгіёнах краіны. Кожнае з масавых святочных мерапрыемстваў, незалежна ад маштабу, забяспечвалі падтрымкай дзяжурныя ўрачы і брыгады «хуткай дапамогі» — але, на шчасце, паводле слоў галоўнага педыятра Міністэрства аховы здароўя Валянціны Труханові́ч, іх дапамога нікому не спатрэбілася, і навагоднія ды калядныя святы прайшлі без эксцэсаў.

Між іншым, сёлета афіцыйныя шэфы і добраахвотныя памочнікі як ніколі адказна падышлі да выбару падарункаў, загадзя ўзгадніўшы з дзіцячымі дамамі, сацыяльнымі прытулкамі, школамі-інтэрнатамі, у чым менавіта яны і іх выхаванцы адчуваюць патрэбу. Таму не дзіва, што ў агульнай колькасці падарункаў значна вырасла доля гаджэтаў, камп'ютарных прылад, мультымедыйных прыстасаванняў, наогул сучаснай тэхнікі. Нават на Галоўнай ёлцы краіны, гасцямі якой сталі больш за 2370 маленькіх беларусаў і ўкраінцаў, якія пражываюць цяпер на тэрыторыі Беларусі, дзеці ўпершыню атрымалі ў дадатак да салодкага падарунка флэшносьбіт з падборкай цікавых матэрыялаў пра Беларусь.


Фота БЕЛТА.

«Сярод новых добрых пачынанняў, якія, я спадзяюся, стануць традыцыяй, — тое, што дзеці, атрымаўшы падарункі, не пакінулі без увагі людзей пажылога ўзросту, сярод якіх шмат адзінокіх, і ў сваю чаргу стварылі святочны настрой для іх. Дзіцячыя валанцёрскія атрады з розных устаноў і арганізацый наведалі па месцы жыхарства ветэранаў вайны, інвалідаў, заслужаных працаўнікоў розных галін, перадалі ім загадзя падрыхтаваныя падарункі і самыя цёплыя віншаванні, а таксама зладзілі шматлікія святочныя мерапрыемствы ў дамах-інтэрнатах для састарэлых», — падкрэсліў Віктар Якжык. Адной з прыкметных падзей у гэтым кірунку, дарэчы, стаў музычны спектакль, які ў межах візіту кіраўніка дзяржавы арганізавалі напрыканцы снежня вучні Астрашыцка-Гарадоцкай сярэдняй школы для жыхароў сталічнага дома-інтэрната для пенсіянераў і інвалідаў.

Яшчэ адна з прыемных тэндэнцый цяперашняй акцыі «Нашы дзеці» — масавае адкрыццё дзіцячых дамоў сямейнага тыпу (ДДСТ). Напярэдадні і падчас правядзення сёлетняга маштабнага дабрачыннага свята было адкрыта 14 ДДСТ у розных рэгіёнах краіны, літаральна пазаўчора гэтая лічба акругліася да 15 — ключы ад новага катэджа ў Быхаве атрымала шматдзетная сям'я Шушлаковых. А гэта значыць, што яшчэ некалькі дзясяткаў дзяцей трапілі з казённых сцен інтэрнатных устаноў ва ўтульную атмасферу хатняй цеплыні.

І яшчэ адна пазітыўная дэталь — нягледзячы на вызначаныя тэрміны (з 12 снежня па 11 студзеня), у рэспубліканскай дабрачыннай акцыі «Нашы дзеці» не была пастаўлена кропка ў апошні яе «афіцыйны» дзень. Бо многія ўдзельнікі працягвалі дарыць свята дзецям і на стары Новы год, і пазней, імкнучыся, каб без увагі, дапамогі і падтрымкі, без любові і клопату не засталіся ніводны дзіцячы дом-інтэрнат і бальніца, дзіцячы дом сямейнага тыпу, апякунская і прыёмная сям'я... А ці не гэта галоўнае?

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК** ■

■ На слыху!

# НЕ КАНФІСКУЮЦЬ, АЛЕ АШТРАФУЮЦЬ

## Здача «льготнай» кватэры можа каштаваць яе ўладальніку да 5,4 млн рублёў

**Размовы пра тое, што трэба жорстка спыняць арэнду «сацыяльных» кватэр, вяліся ўжо не першы год. Яшчэ год таму па Мінску гуляла пагалоска, што пужала канфіскацыяй маёмасці тых дзялкоў, якія пабудавалі кватэры з выкарыстаннем ільготных крэдытаў і выкарыстоўваюць гэтае памяшканне дзеля дадатковага заробку. Потым сітуацыя з арэндай падобнага жылля супакоілася, бо стала зразумела, што кватэру пры такім парушэнні ніхто ў гаспадара не забярэ. А штрафы былі невялікія — прынамсі, пакуль...**

Учора на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале pravo.by былі апублікаваны папраўкі ў Адміністрацыйны кодэкс пад № 243-З. Там існуе артыкул 23.86 пад назвай «Парушэнне парадку прадастаўлення жылых памяшканняў, пабудаваных (рэканструяваных) або набытых з прыцягненнем ільготнага крэдыту, па дагаворы найму або арэнды». Там, у прыватнасці гаворыцца, што «Прадастаўленне грамадзянінам жылога памяшкання (яго часткі), пабудаванага (рэканструяванага) або набытага з прыцягненнем ільготнага крэдыту, па дагаворы найму жылога памяшкання прыватнага жыллёвага фонду або па дагаворы арэнды жылога памяшкання да поўнага пагашэння льготнага крэдыту без дазволу адпаведнага мясцовага выканаўчага і распарадчага органа, калі ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі патрэбен такі дазвол, — цягне накладанне штрафу ў памеры ад чатырох да трыццаці базавых велічынь.



Атрымліваецца, што цяпер штрафы за падобнае парушэнне будуць вагацца ад 720 тысяч да 5 млн 400 тысяч рублёў. Крыху ніжэй у дакументе гаворыцца, што за **тое ж дзеянне, учыненае паўторна на працягу аднаго года пасля накладання адміністрацыйнага спагнання, памеры штрафу істотна павялічваюцца і будуць складаць ужо ад 30 да 50 базавых велічынь**. А гэта ўжо — ад 5 да 9 млн рублёў.

Калі ўважліва пачытаць вышэйназваны дакумент, то стане зразумела, што караць рублём цяпер будуць не толькі за здачу ўсёй «ільготнай» кватэры, але забаронена сёння і зарабляць на яе часткі (пры здачы пакоя) да поўнага пагашэння запазычанасці па льготным крэдыце.

**Сяргей КУРКАЧ** ■

## Кабіну засыпала содай

**Каля шасці гадзін раніцы відавочца паведаміў па тэлефоне «101» пра дарожна-транспартнае здарэнне паблізу вёскі Чарцяж на трасе Мінск — Віцебск. Кабіну пацярпелага грузавіка засыпала мяхамі з цягача, з якім ён сутыкнуўся.**

У аварыю патрапілі сядзельны цягач «Рэно» і грузавы аўтамабіль «Мерседэс» — адбылося іх бакавое сутыкненне. Цягач перавозіў соду ў мяхах, якімі і засыпала кабіну грузавіка. Унутры транспартнага сродку аказаўся заблакіраваным кіроўца. Выратавальнікам давялося напачатку расчышчаць месца ад хімічнага рэчыва для доступу да кабіны, каб можна было дастаць кіроўцу 1984 года нараджэння. Са шматлікімі траўмамі ён быў шпіталізаваны, кіроўца сядзельнага цягача не пацярпеў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## «ЗАЛАТАЯ» РЫБКА

**Незаконны ўлоў абярнуўся для браканьераў шматмільённым штрафам.**

Парушальнікаў затрымалі ў Карэліцкім раёне пасля таго, як з дапамогай электраўстаноўкі яны здабылі адзінаццаць платвічак, два шчупачкі, дзве гусцёркі, галаўня і верхаводку. Увогуле рыба не заважыла і паўтара кілаграма, аднак існуе методыка разліку прычыненай шкоды ў перыяд нерасту. Дык вось яна была ацэнена ў 9,5 мільёна рублёў, што кваліфікуецца заканадаўствам як буйны памер. Прычым, толькі кампенсацыяй гэтай шкоды пакаранне двух браканьераў не абмяжоўвалася. Суд прыгаварыў кожнага з іх да штрафу ў памеры 30 мільёнаў рублёў.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

■ Узровень

# НАВУКА — НЕ ЯРМО НА ШЫІ ДЗЯРЖАВЫ

**«Вучоны — гэта «штучны тавар», таму мы не збіраемся масава прымаць у навуку ўсіх ахвотных», — такую думку выказаў на прэс-канферэнцыі з нагоды Дня беларускай навукі старшыня прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Уладзімір ГУСАКОЎ.**

## ТОП-100 ДЛЯ ПРАМЫСЛОВАСЦІ

Набор у аспірантуру і дактарантуру ў акадэміі не змяншаецца. Летась, напрыклад, структурныя падраздзяленні акадэміі папоўнілі 323 маладыя навукоўцы. Моладзь да 29 гадоў складае 21% ад агульнай колькасці навуковых супрацоўнікаў акадэміі. А калі ўзяць узрост да 35 гадоў, то лічба будзе яшчэ большай — да 40%. Гэта дастаткова высокія паказчыкі, якія дазваляюць забяспечыць пераемнасць пакаленняў і працяг работы вядучых навуковых школ.

**Пераможцы і фіналісты рэспубліканскага маладзёжнага конкурсу «100 ідэй для Беларусі» і іншых конкурсаў змогуць прыняць удзел у летняй школе «Сколкава».**

Што тычыцца памераў заробкаў, на якія могуць разлічваць маладыя супрацоўнікі акадэміі, то яны наўпрост залежаць ад здольнасцяў і ступені ўдзелу маладых навукоўцаў у розных нацыянальных і міжнародных праектах і дагаворах. Сярэдні ж заробак навукоўца, які робіць першыя крокі, складае каля 2,5—3 мільёнаў рублёў.

— Безумоўна, матэрыяльны складнік — важны, але трэба разумець, што матэрыяльнае прыходзіць з часам. Навука — гэта ўсё ж не сфера бізнесу, а найперш сфера для рэалізацыі таленту і сваіх ідэй, — падкрэсліў Уладзімір Гусакоў.

Старшыня Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук упэўнены, што называць навуку ярмом на шыі дзяржавы няправільна, паколькі доля бюджэтных сродкаў у агульным аб'ёме фінансавання ўстановы складае ўсяго 25% і працягвае скарачацца. Навуковыя даследаванні фінансуюцца за кошт заключаных дагавораў, у тым ліку з замежнымі партнёрамі, дзякуючы прыцягненню грантаў і іншых крыніц.

Наогул, беларуская навука ўсё больш інтэгруецца ў эканоміку. Напрыканцы мінулага года ў Акадэміі навук вызначылі ТОП-10 вынікаў за 2014 год у галіне фундаментальных і прыкладных даследаванняў. А цяпер у акадэміі фарміруюць ТОП-100 інавацыйных распрацовак для прамысловасці. Летась у Акадэміі навук было адкрыта 10 новых цэнтраў і вытворчасцяў для стварэння інавацыйнай прадукцыі. Яшчэ каля дзесяці будуць адкрыты ў 2015 годзе.

## СТАРТАП-ТУР АД «СКОЛКАВА»

**Старшыня Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Аляксандр ШУМІЛІН** расказаў, што сёння ў краіне выконваюцца 23 дзяржаўныя навукова-тэхнічныя праграмы. У іх рамках з пачатку пяцігодкі (гэта значыць, з 2011 года) створана 413 найменняў машын, абсталявання, прыбораў; 324 найменні матэрыялаў і рэчываў, інструментаў, дэталяў машын; 282 тэхналагічныя працэсы; 225 аўтаматызаваных сістэм і комплексаў; 696 гатункаў раслін і парод жывёл. Атрымана 544 патэнты і пададзена 612 заявак на патэнт.

Аляксандр Шумілін паведаміў, што расійскі фонд «Сколкава» правядзе ў сакавіку ў Мінску стартап-тур. Гэта выдатная магчымасць для маладых навукоўцаў прадставіць свае інавацыйныя праекты. «Да нас прыедуць эксперты, якія змогуць не толькі ацаніць і выбраць найбольш перспектыўныя праекты, але і растлумачаць, як трэба прасоўваць сваю распрацоўку. Мы запланавалі шэраг лекцый і кансультацый, плануюцца нават індывідуальныя кансультацыі з аўтарамі тых праектаў, якія найбольш зацікавяць экспертаў», — растлумачыў ён.

Ад беларускага боку адказным за правядзенне стартап-тура будзе Беларускі інавацыйны фонд. Удзел у ім возьмуць фіналісты конкурсаў маладзёжных інавацыйных праектаў «100 ідэй для Беларусі», Нацыянальнай акадэміі навук, Міністэрства прамысловасці.

Таксама пераможцы і фіналісты рэспубліканскага маладзёжнага конкурсу «100 ідэй для Беларусі» і іншых конкурсаў змогуць прыняць удзел у летняй школе «Сколкава». Гэта мерапрыемства прадугледжвае ўдзел у серыі навуковых семінараў, якія фонд праводзіць з прыцягненнем вядучых замежных і расійскіх спецыялістаў у галіне інавацыйнай дзейнасці. Плануецца, што ў летняй школе паўдзельнічаюць да 30 прадстаўнікоў ад Беларусі.

## ВЫРАСЦІЦЬ БУДУЧАГА НЬЮТАНА

**Міністр адукацыі Міхаіл ЖУРАЎКОЎ** паведаміў, што сёлета Дні беларускай навукі праходзяць пад дэвізам «Моладзь. Навука. Інавацыі». Па яго словах, ва ўсім свеце адукацыя і навука з'яўляюцца галоўнымі стратэгічнымі рэсурсамі развіцця. Таму ў гэтых умовах узрастае роля універсітэтаў і універсітэцкай навукі.



Фота Надзеі БУЖАН.

Міністр падкрэсліў, што інавацыі, крэатыў, пошук новага там, дзе, здавалася б, ужо ўсё вядома і адкрыта, — прэрагатыва маладых і энергічных, тых, хто прагне адкрыццяў і гатовы да іх. З кожным годам цікавасць студэнцкай моладзі да занятку навуковай дзейнасцю расце. Напрыклад, у аспірантуры сістэмы Міністэрства адукацыі праходзяць падрыхтоўку 2769 будучых Ньютанаў, Эйнштэйнаў і Алфёравых, а ў дактарантуры вучацца 108 навукоўцаў. Але будучы вучоны фарміруецца яшчэ ў студэнцкія гады.

Каб актывізаваць даследчую працу студэнтаў, Міністэрства адукацыі штогод праводзіць сярод іх Рэспубліканскі конкурс навуковых работ. Найважнейшым патрабаваннем да навуковага даследавання з'яўляецца атрыманне новых ведаў і навуковых вынікаў, якія гарантуюць магчымасць іх практычнага прымянення ў розных галінах эканомікі і сацыяльнай сферы. Такія ж умовы прад'яўляюцца і да студэнцкай навукі.

**Інавацыі, крэатыў, пошук новага там, дзе, здавалася б, ужо ўсё вядома і адкрыта, — прэрагатыва маладых і энергічных, тых, хто прагне адкрыццяў і гатовы да іх.**

У XX Рэспубліканскім конкурсе навуковых работ прынялі ўдзел студэнты і выпускнікі 58 устаноў вышэйшай адукацыі і філіялаў, у конкурсе ўдзельнічалі 3834 навуковыя працы. Сярод аўтараў работ былі студэнты ўсіх курсаў. Свае работы на конкурс заяўляюць нават першакурснікі (апошні раз іх было 9 чалавек). Але больш за трацiну аўтараў (38%) складаюць выпускнікі.

Міхаіл Жураўкоў запэўніў, што навукова-тэхнічныя распрацоўкі і інавацыйная прадукцыя ВНУ запатрабаваны на міжнародных рынках. Найбольшым попытам карыстаюцца навуковыя распрацоўкі ў галіне нанатэхналогій і новых матэрыялаў, радыёэлектронікі, інфармацыйных тэхналогій, тэлекамунікацый, лазерных тэхналогій, энерга- і рэсурсазберажэння, медыцыны і аховы здароўя, металургіі, будаўніцтва і лёгкай прамысловасці.

У сістэме Міністэрства адукацыі функцыянуюць 4 тэхнапаркі, якія атрымалі ў Дзяржаўным камітэце па навуцы і тэхналогіях статус суб'ектаў інавацыйнай інфраструктуры.

У 2014 годзе даход беларускіх ВНУ ад рэалізацыі сваёй навукова-тэхнічнай прадукцыі на знешніх рынках склаў каля $7 млн.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

■ На кантролі

# ГРОШЫ НА ВЕЦЕР

## Бюджэтныя сродкі затрачаны. А эфект?

**Камітэт дзяржаўнага кантролю Гродзенскай вобласці пацікавіўся, наколькі эфектыўна выкарыстоўваюцца бюджэтныя сродкі на рэалізацыю будаўнічых праектаў.**

## НЕПАТРЭБНЫЯ ПРАЕКТЫ

Высветлілася, што фінансавыя і гаспадарчыя службы правераных райвыканкамаў не валодаюць нават звесткамі аб колькасці накіраваных на гэтыя мэты грошай. Хоць затраты вельмі значныя. За 2012-2013 гады толькі інстытут «Гроднаграмадзянпраект» за кошт бюджэту выканаў праектных работ на агульную суму 133,1 мільярда рублёў — гэта 89% ад агульнага аб'ёму выручкі, атрыманай праектнай арганізацыяй. Пры гэтым у кожным з правераных раёнаў выяўлены факты, калі па рашэннях мясцовых органаў улады праекты распрацоўваюцца і аплачваюцца, але ў далейшым застаюцца незапатрабаванымі.

Напрыклад, Астравецкі райвыканкам у 2008 годзе вырашыў пабудаваць у вёсцы Тракенікі школу на 200 месцаў і невялікую лазню. З раённага бюджэту разлічыліся за распрацоўку праектна-каштарыснай дакументацыі, геадэзічныя і вышукальныя работы (107,8 мільёна рублёў). А ўжо ў сакавіку 2009 года прынялі рашэнне... аб немэтазгоднасці будаўніцтва школы, бо не маюць у ёй патрэбы ў бліжэйшай перспектыве. Што тычыцца лазні, то за два гады з абласнога і раённага бюджэтаў на яе ўзвядзенне затрацілі 176,6 мільёна рублёў. Аднак у ліпені 2009-га будаўніцтва спынілі, аб'ект у эксплуатацыю не ўведзены.

Альбо такі факт. У 2011 годзе, згодна з рашэннем Смаргонскага райвыканкама, распрацавалі праекты на тры аднакватэрныя жылыя дамы ў вёсцы Войстам, сеткі электра- і водазабеспячэння, аб'екты транспартнай інфраструктуры. Раённы бюджэт затрачаны на гэта больш за 10 мільёнаў рублёў. А потым праектная дакументацыя аказалася... непатрэбнай, бо ў сувязі з аб'яднаннем сельскагаспадарчых арганізацый будаваць гэтыя дамы ўжо не плануецца. Нельга было прадбачыць?

У Ашмянскім раёне да цяперашняга часу не задзейнічаны праект «Добраўпарадкаванне набярэжнай ракі Ашмянка» (кошт дакументацыі па дагаворы — 153,3 млн руб., за якую ў 2008 годзе заплацілі з бюджэту 25 млн руб.) А ў Воранаўскім раёне пакуль застаецца незапатрабаванай праектная дакументацыя (распрацавана ў 2012 годзе) на будаўніцтва водаправодных сетак у аграгарадках Пагародна, Воранаўка і Тракелі. Неэфектыўна выкарыстана 130,8 мільёна рублёў бюджэтных грошай.

Адсутнасць належнага кантролю за падрыхтоўкай праектна-каштарысных дакументаў вядзе да таго, што будаўніча-мантажныя работы ў поўным аб'ёме не выконваюцца. Пры гэтым непрадугледжаныя праектам дадатковыя работы ў шэрагу выпадкаў у разы перавышаюць узровень, які вызначаны заканадаўствам (10%). Гэта сведчыць пра нізкую якасць праектавання і, зноў жа, вядзе да дадатковага расходавання дзяржаўных сродкаў.

Акрамя таго, праверкай інстытута «Гроднаграмадзянпраект» выяўлены факты ўключэння ў праектную дакументацыю завышаных аб'ёмаў будаўніча-мантажных работ і кошту матэрыялаў. Толькі па выніках апошніх праверак прадухілена залішняе расходаванне 1693,5 млн руб. бюджэтных сродкаў і 617,6 млн руб. — крэдытных сродкаў на будаўніцтва жылля.

## АДРАМАНТАВАЛІ І... ЗАКРЫЛІ

Нерацыянальныя затраты здараюцца і тады, калі не ўлічваюцца рэальныя перспектывы населеных пунктаў. Як гэта адбылося, напрыклад, у Лідскім раёне з праектам будаўніцтва аграгарадка ў вёсцы Голдава. Рамонт будынка сярэдняй школы — дзіцячага сада ў 2010 годзе каштаваў бюджэту больш за 1 мільярд рублёў. Пры гэтым у той год адукацыйную ўстанову плошчай 1755 квадратных метраў, разлічаную на 320 выхаванцаў, наведвалі толькі 41 — са штатам педагагічнага і абслуговага персаналу ў складзе 32-х чалавек. У 2012-2013 гадах колькасць вучняў зменшылася да 31, а летась школу-сад закрылі. Дзеці вучацца ў суседняй вёсцы Ходараўцы, куды арганізавалі падвоз. А адрамантаваны будынак пустуе, і нават ёсць факты яго неабгрунтаванага разукамплектавання.

Выяўлены таксама выпадкі выбару праектных арганізацый з парушэннем заканадаўства. Напрыклад, правялі падрадныя таргі на выбар праекціроўшчыка міні-ЦЭЦ кацельні № 1 Смаргонскага РУП ЖКГ. Камісія прызнала пераможцам ТАА «ТэхнаПраектІнвест» (г. Мінск). Пры гэтым заплюшчылі вочы на тое, што пераможца не падаў у конкурсную дакументацыю звесткі, якія б далі поўную ацэнку яго плацежаздольнасці. На распрацоўку праекта пералічылі аванс у суме 150 мільёнаў рублёў. Аднак сваіх абавязацельстваў праектная арганізацыя не выканала, а потым яна была прызнана лжэпрадпрымальніцкай структурай і ў дачыненні яе службовых асоб завялі крымінальную справу.

Калегія Камітэта дзяржаўнага кантролю Гродзенскай вобласці дала даручэнні ўстараніць выяўленыя парушэнні. Выканаўчыя камітэты павінны вызначыцца, наколькі мэтазгодна далейшая рэалізацыя праектаў і работ за кошт бюджэтных сродкаў.

**Барыс ПРАКОПЧЫК**

# СЛУХАЦЬ ФАЛЬКЛОР І... ПРЫСЛУХОЎВАЦЦА ДА СЯБЕ

## Народная песня аб'ядноўвае невыпадковых людзей

**Зямля не толькі корміць, дае прытулак, але і прыцягвае таленты. Можа, таму беларуская глыбінка такая багатая на фальклорныя аматарскія калектывы. Там ведаюць і паважаюць свае карані, працягваюць і захоўваюць традыцыі той мясцовасці, дзе нарадзіліся альбо аказаліся па волі лёсу, і, безумоўна, знаходзяць час для душэўных песень. Чарговым таму пацвярджэннем стала сумесная фальклорная экспедыцыя карэспандэнта «Звязды» са здымачнай групай праекта «Наперад у мінулае» тэлеканала «Беларусь-3» у вёску Пратасевічы Асіповіцкага раёна...**



Вядома, што мясцовасць, дзе знаходзіцца сучасная вёска, узгадвалася ў «Літоўскай хроніцы» пад назвай Прудашэвічы прыкладна ў 1473 годзе. Менавіта тады, паводле архіўных звестак, княгіня Марыя Гальшанская (удава Сямёна Гальшанскага) атрымала ў часовае карыстанне гэтую вёску. Пазней, у 1513 годзе, Пратасевічы ўваходзілі ў склад Свіслацкай воласці Мінскага ваяводства Вялікага Княства Літоўскага. Назва населенага пункта паходзіць ад слова «пратас» — драўлянае прыстасаванне, якім укатвалі гліну на гарышчы для яго ўцяплення. Да гэтай пары тут захаваліся старыя назвы вуліц, завулкаў, лясоў і палёў вакол вёскі. Напрыклад, Добры востраў — гэта палянка ў лесе каля Пратасевічаў. Раней на гэтым месцы было шмат суніц, і мясцовыя жанчыны заўсёды вярталіся адтуль са «здабычай» свежых ягад. Альбо вось яшчэ адна назва: «жэрванок» — так называюцца ўзгоркі ўздоўж рэчкі, што знаходзіцца побач з вёскай. Па меркаваннях старажылаў, на гэтых узгорках некалі знаходзілі вялікія плоскія камяні, з якіх потым рабілі жорны для хатняга выкарыстання. А мясцовы дыялект ператварыў слова «жорнавы» ў «жэрванок»...

Нязменным багаццем гэтай зямлі, здаецца, засталіся людзі, якія тут жывуць, бо яны гасцінныя, працавітыя і з песняй у душы. У такіх калектываў, як народны ансамбль беларускай музыкі і песні «Сузор'е», можна знайсці багатую палітру творчасці. У выкананні яго ўдзельнікаў (яны розныя нават па ўзросце — ад хлапчукоў і дзяўчат да дарослых мужчын і жанчын) можна пабачыць адмысловыя танцы, песні. І пасля кожнага нумара хочацца працягу гэтай асалоды... Асабліва заварожвалі песні, якія выконваліся акапэльна. Так, адна з юных салістак калектыву Ліза Заяц выканала «Сіня морушка глыбока» і «Няхай будзе пагодачкай»:

*Сіня морушка глыбока,*
*Дай не відна ў моры дна.*
*Я ад маменькі далёка,*
*Дай не бачылась года два.*
*Ой, на што ж ты мяне, мамачка,*
*Дай у пятніцу радзіла?..*
*...Усім жа месяц свеціць ясненькі,*
*А мне ночанька дацямна.*
*Усім жа свята нядзеляйкай,*
*А мне горачка да бяда.*

Ліза сваім голасам многіх заставіла прыслухоўвацца, і яе талент не застаецца незаўважаным. У мінулым годзе яна разам з іншымі «сузор'еўцамі» прымала ўдзел у фестывалі «Факел» у Белградзе. Там юную спявачку адзначыла народная артыстка Расіі Аляксандра Пермякова, якая ўзначальвала журы. У выніку Ліза заняла 2-е месца ў намінацыі «Народны вакал» і атрымала магчымасць паўдзельнічаць у фінале фестывалю, што адбудзецца вясной у Славеніі.

Не менш чароўнай і кранальнай аказалася і сіроцкая песня-галашэнне ў выкананні Алены Нішур:

*Сіротанька жыта жала,*
*К сырой зямле прылягала.*
*З сырой зямлёй гаварыла:*
*— Ты сырая маць-зямелька,*
*Узяла бацьку, узяла мамку,*
*Узяла ўсю маю радзінку,*
*Вазьмі мяне сірацінку.*

Пакуль дзяўчаты выконваюць свае сольныя песні, у калідоры астатнія ўдзельнікі, хвалюючыся, рэпецiруюць наступныя нумары. А некаторых артыстаў чакаем, бо не ва ўсіх атрымалася вырвацца з работы. Напрыклад, адзін з удзельнікаў «Сузор'я» Аляксандр развозіць хлеб па раёне, таму часам даводзіцца ахвяраваць справай для душы на карысць працы...

Ансамбль народнай музыкі і песні «Сузор'е» існуе ўжо 25 гадоў, і яго ўдзельнікі пра сябе кажуць, што яны не народныя артысты, а артысты з народу.

— «Сузор'е» ў 1988 годзе заснавала яшчэ мая маці, Соф'я Мароз, што працавала ў сельскім Доме культуры. Туды прыходзілі мясцовыя жыхаркі спяваць песні, танцаваць і ладзіць розныя абрады. Я была дзіцем, якое за ўсім гэтым назірала, — расказвае сённяшні кіраўнік ансамбля Наталля Еўдакімовіч. — Мне заўсёды хацелася, каб у калектыве былі мужчыны, хаця традыцыйна ў вясковых фальклорных ансамблях пераважаюць жанчыны.

Калі пасля заканчэння ўніверсітэта Наталля вярнулася ў родную вёску, то ў пэўным сэнсе яна была ўжо чалавекам з вопытам. Бо за студэнцкія гады не толькі веды атрымлівала (па прафесіі яна выкладчык па класе баяна), але і наведала шматлікія канцэрты розных калектываў, такіх як «Цернiца», «Неруш», «Баламуты»... Імі захапляліся і на іх арыентаваліся. А з часам пачалі і сябе паказваць не толькі ў Беларусі, але і за мяжой. У 2004 годзе адбылася першая такая паездка ў Славакію. Потым былі фестывалі і гастролі. Як адзначаюць удзельнікі «Сузор'я», кожная з паездак пасвойму запамінальная, бо часам знаёмствы з іншымі нацыянальнасцямі адбываюцца без слоў, а толькі праз песні, усмешкі...





Пратасевічы маюць таксама шмат цікавых традыцый. Раней месяцы з большай увагай ставіліся да царкоўных святаў. Напрыклад, як кажуць, на Вялікдзень птушка гнязда не ўе, а жанчына валасоў не расчэсвае, таму гатавалі розныя прысмакі (разам з тым трымалі пост і ніхто яго не парушаў), апраналіся ва ўсё новае і так сустракалі свята. Каталі яйкі на лавачцы, гулялі ў розныя гульні. Святкуючы Купалле, збіралі розныя зёлкі. Кажуць, у гэтай вёсцы жыло многа бабуль-шаптух. На Каляды прыходзілі ў хату і, жадаючы дабрабыту, абсыпалі гаспадароў збожжам, якое павінна было ляжаць у калядную ноч на падлозе. Наталля Еўдакімовіч расказвала, што ёй любоў да фальклорнай творчасці перадалася не толькі ад маці, бо яшчэ яе бабуля і прабабуля таксама былі пявуннямі. А дзед быў найлепшым танцорам на вёсцы. Лічылася, што такі хлопец выбірае ў нявесты сабе самую прыгожую дзяўчыну. Так, відаць, два аматары народнай творчасці аб'ядналіся ў сям'ю невыпадкова. Бо і да сёння працягваецца сямейнае захапленне спевамі і танцамі.

**Часам знаёмствы з іншымі нацыянальнасцямі адбываюцца без слоў, а толькі праз песні, усмешкі...**

Дарэчы, спынімся на святкаванні вяселля. Перш, чым гуляць тыдзень і ўсёй вуліцай святкаваць нараджэнне новай сям'і, дамаўляліся на ўзроўні бацькоў. Малады са сваімі бацькамі і маці ішоў да маладой прасіць яе рукі. Калі дзяўчына перадумала выходзіць замуж, то выкочвалі гарбуз, што быў сведчаннем адмовы. Але не варта пра сумнае, лепш пра вясёлае і адметнае пагаварыць. Вызначыўшыся з датай вяселля, маладыя не бачыліся тыдзень. Нявеста склікала сябровак, з якімі ладзілі пасядзелкі з песнямі (аплаквалі дзявочую долю і расчэсвалі косы маладой), а хлопец праводзіў гэты час з сябрамі за гульнямі. На вяселле гатавалі стравы ўсёй вуліцай, з кожнай хаты нешта прыносілі. З песнямі замешвалі каравай, а калі ён выпякаўся, то ў доме паводзілі сябе як мага цішэй. Бо, калі каравай падгараў ці перапякаўся, то гэта лічылася дрэнай прыкметай для будучай сям'і. На вяселле маладых везлі на запрэжаных конях, упрыгожаных званочкамі, каляровымі стужкамі. Малады і маладая ехалі стоячы. Калі дзялілі каравай, то родныя і сябры дарылі новай сям'і падарункі. Пасля вяселля маладая жыла ў доме бацькоў мужа і цэлы тыдзень не мела нават права зайсці да сваіх маці і бацькі. А тыя ў сваю чаргу праз тыдзень чакалі маладых у госці.

Дзяўчаты выходзілі замуж не толькі за мясцовых хлопцаў. Недалёка ад вёскі знаходзіўся ў былыя часы вайсковы палігон, дзе стаялі гарнізоны казакоў. Бывала, што вясковым хлопцам даводзілася нават абараняць сваіх дзяўчат ад «гасцей». Але калі казак перамагаў, то меў права забраць дзяўчыну, якая яму спадабалася. Таму нямала раз'ехалася адсюль дзяўчат па ўсім свеце...

*Ішоў казак дарогаю,*
*Сустрэў дзеўку, зваць Галяю.*
*— Пастой дзеўка, пастой, красна,*
*Я штось табе сказаць маю.*

*Я штось табе сказаць маю:*
*Сем загадак я загадаю.*
*Адгадаеш — мая будзеш,*
*Не адгадаеш — чужа будзеш.*

*Ой, што расце без кораня?*
Першы раз я была ў гасцях у народнага майстра шэсць гадоў таму. Ён ужо жыў адзін у сваёй вёсцы, але выглядаў вясёлым і рухавым. Мог быць і сур'ёзным, калі гаварыў пра важныя для яго рэчы. Тады мы прыехалі ў Стойлы разам з нядаўна прызначаным загадчыкам аддзела культуры райвыканкама Канстанцінам Панімашам. Маладому кіраўніку культурнай галіны раёна Тарасюк сказаў тады: «Жадаю табе, сынок, — потым прыгледзеўся, — не, хутчэй, унучак, весці культуру так, каб яна ў раёне не ў хвасце плялася, а наперадзе ішла, бо культура — гэта ж душа, гэта самае галоўнае...» І не дагаварыў, зажаліўся. Сентыментальным быў пажылы майстар, калі разважаў пра набалелае.



вадзяны млын. А рыбы вадзілася столькі, што мясцовыя жыхары яе прадавалі. Але ў 50-я гады падчас меліярацыі рэчышча ракі было адведзена ўбок, і яна абмялела, абязводзілася. Цікава ён разважаў пра рэчку, гаварыў пра яе, нібы пра жывую: «Калі спявалі песні, іх было чутно ў Брадах, яны па рацэ плылі». Даўно ўжо ніхто не спявае ў Стойлах. А дзядуля Мікалай, пакуль мог, кожную вясну запрагаў Орліка і араў столькі зямлі, колькі мог працаваць. Гэта быў яго асабісты пратэст супраць вымірання вёскі.

Свой сум майстра і селяніна ён увасобіў у драўляных фігурках, якія называў драўляным народам. Майстар-самавучка выразаў фігуркі з паленцаў, упрыгожваў іх лазой, саломай і кампанаваў у сюжэты найбольш з сялянскага жыцця і побыту. Вясёлыя і сумныя героі Тарасюка жывуць цяпер у розных музеях і калекцыях, нямала народу засталося і ў пабудаванай для іх драўлянай хаце, якую майстар назваў «Успаміны Бацькаўшчыны». У хаце размясцілася цэлая драўляная вёска з цэрквамі і разнастайнымі малюнкамі жыцця. Разглядаць гэтыя сюжэты вельмі цікава яшчэ і таму, што яны суправаджаюцца асабістымі под-

А вось калі весяліўся, яго любімай ланкай была «сабача атрава». Уласна кажучы ён тады і сустрэў нас гэтымі словамі. Аказалася, «камплімент» быў адрасаваны хлопцам з аддзела культуры, бо паводле ацэнкі жыхара Стойлаў, даўнавата не былі, забыліся на старога. Пазней мы зразумелі, што словазлучэнне мае не крыўднае адценне, а, хутчэй, свойска-гумарны сэнс. Калі гаспадар абняў за шыю любімага каня са словамі «ну што, Орлік, сабача атрава», стала ясна, што яны могуць мець і ласкавае значэнне.

Сам надзвычай жвавы і дасціпны Мікалай Васільевіч вельмі любіў усё жывое. На падворку яго было поўна катоў і сабак. Сабакі добрыя, на чужых людзей не брахалі, толькі хвастамі вілялі. А сярод катоў гаспадар вылучаў чорнага дрэсіраванага «акрабата»: такія па з ім рабіў, што аж глядзець страшна было, а кату — хоць бы што. Сваіх чатырохногіх сяброў ён часам называў «негадзяі». І слова «негадзяй» у Тарасюка мела шмат значэнняў: гэта і прамы сэнс — дрэнны, кепскі чалавек, і састарэлы хворы — негадзяшчы, і ласкава-пяшчотлівы — амаль «харошы мой». Ён і словы прыдумваў, і сюжэты да іх. Селянін-філосаф.

Самым вялікім сумам усяго жыцця народнага майстра была яго паміраючая вёска. «Вось іду па вёсцы — там плуг іржавы валяецца, там барана дагнівае, там серп, зачэплены за плот, парыжэў ад дажджу. Не магу глядзець, дзеткі, іду і плачу», — казаў тады Мікалай Васільевіч. Сапраўды, вельмі сумную карціну ўяўляюць сабой Стойлы. Вёска знаходзіцца фактычна на ўскрайку Белавежскай пушчы, за 50 кіламетраў ад райцэнтра. Калгас даўно перастаў існаваць. І землі ў ваколіцы, некалі меліяраваныя, выйшлі са строю, зараслі бур'янам. Дзічэюць і зарастаюць апусцелыя сядзібы.

Апошні жыхар вёскі расказваў, што некалі на рацэ Левая Лясная працаваў






пісамі аўтара. Ну вось такімі, напрыклад: «Некалі мужычок па зямлі плакаў, а цяпер зямля па мужычку плача». У апошнія гады ў працах яго прысутнічала тэма адыходу на вечны спачын, адпявання, пахавання: «Нас не будзе, але хтосьці будзе, хтосьці ўспомніць».

Успомніць будзе што. Найперш гэта драўляны народ, які асірацеў без свайго майстра, але застаўся на ўспамін нашчадкам. Усяго, паводле некаторых падлікаў, Мікалай Тарасюк выразаў каля 30 тысяч фігурак. У 2002 годзе майстар стаў лаўрэатам спецыяльнай прэміі Прэзідэнта краіны. У 2008 годзе выйшла кніжка — цудоўны альбом-манаграфія Вольгі Лабачэўскай «Сялянская энцыклапедыя ў творах Мікалая Тарасюка». Вольга Лабачэўская, фотамайстар Георгій Ліхтаровіч уклалі свае душу і сэрца, каб пераказаць, адлюстраваць усю ўзнёсласць, усе перажыванні майстра ў яго асэнсаванні жыцця, часу, навакольнай рэчаіснасці. Кніга, выдадзеная пры падтрымцы Брэсцкага аблвыканкама, была шырока прэзентавана і мела розгалас. А нядаўна зняты дакументальны фільм пра майстра са Стойлаў.

Пахавалі Мікалая Васільевіча ў вёсцы Вяжное побач з жонкай Надзеяй Васільеўнай. Паводле слоў начальніка аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Пружанскага райвыканкама Канстанціна Панімаша, лёс стойлаўскага музея «Успаміны Бацькаўшчыны» вырашаць дзеці Мікалая Тарасюка. Калі будзе дасягнута ўзаемаразуменне, то райвыканкам гатовы арганізаваць падворак майстра ў гарадскім парку. Пакідаць музей на ранейшым месцы ў пустой вёсцы няма ніякага сэнсу, лічыць Канстанцін Іванавіч.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.**





■ Дзённік настаўніка

# МУЖЧЫН-ПЕДАГОГАЎ — У ЧЫРВОНУЮ КНІГУ?

**Як вядома, настаўнікам года-2014 стаў Віктар Эдуардавіч Жук, малады выкладчык гісторыі з сярэдняй школы № 11 горада Маладзечна.**

Прачытаў аб гэтым і задумаўся.

Нейкі парадокс атрымліваецца.

Усё часцей і часцей на конкурсах прафесійнага майстэрства настаўнікаў перамагаюць менавіта мужчыны, хоць колькасць іх у школах з кожным годам, на жаль, становіцца ўсё меншай.

Не ідуць мужчыны ў школу, і прычын тут аж некалькі. Але пра іх — ніжэй. Спачатку крыху гісторыі.

У XIX стагоддзі прафесія настаўніка была выключна мужчынскай, як, дарэчы, і многія іншыя (урач, інжынер, адвакат, не кажучы ўжо пра ваенных). І была гэтая прафесія не толькі вельмі прэстыжнай і паважанай, але і даволі высокааплачваемай. Мяркуйце самі...

Па школьным статуце 1828 года настаўнік прыходскага вучылішча атрымліваў чын 14-га класа і разам з гэтым асабістае дваранства.

У 1890 годзе Маскоўскае земства плаціла народным настаўнікам (а гэта была самая нізкая іх катэгорыя) па 300 рублёў за год, прыбаўляючы кожныя 3 гады па 50 рублёў, так што настаўнік з 12-гадовым стажам атрымліваў ужо 500 рублёў (у тры разы больш, чым кваліфікаваны рабочы). А Пецярбургскае земства ўстанавіла мінімальны аклад настаўніка пачатковай школы ў 480 рублёў, а тым, хто скончыў гімназію, настаўніцкую семінарыю альбо вышэйшыя педагагічныя курсы — 600 рублёў.

Настаўнікі ж гімназій атрымлівалі ў разы больш і маглі даслужыцца аж да чыну стацкага саветніка (амаль генеральскі). І не дзіўна, што іх жонкі не толькі не працавалі, але і служанак для хатніх спраў наймалі.

Усё змянілася пасля рэвалюцыі, калі было абвешчана раўнапраўе жанчын з мужчынамі ва ўсім, у тым ліку і ў выбары прафесій. І пайшлі жанчыны працаваць не толькі настаўніцамі ў школы, але і на заводы, і нават у забой кайлом махаць.

Але аж да Вялікай Айчыннай вайны колькасць мужчын-настаўнікаў была даволі вялікай. Ды толькі шмат іх загінула за чатыры трагічныя гады, так што ў пасляваенны час колькасць прадстаўнікоў «моцнай паловы» ў школах ужо не дасягала пяцідзесяці працэнтаў. І з таго часу з кожным годам станавілася ўсё меншай і меншай...

А што цяпер?

Тэндэнцыя прасочваецца ўжо падчас вучобы ў педагагічных ВНУ. Колькасць юнакоў там ад нуля (пачатковыя класы і дашкольнае выхаванне) да дзесяці 30% (фізіка, матэматыка)... І не факт, што кожны хлопец пасля атрымання дыплома або абавязковай адпрацоўкі (калі вучыўся на бюджэтнай форме) застанецца ў школе. А многія нават самі ў армію просяцца, каб толькі са школы збегчы (там год адслужыць — тут два адпрацаваць).

Чаму так? Заробак нізкі?

Так, заробкі ў многіх нашых настаўнікаў, на жаль, адны з самых нізкіх па краіне. А мужчыны, такая ўжо традыцыя, хочуць быць сапраўднымі «галоўнымі ў сям'і», у тым ліку і па заробку. Таму і не імкнуцца ў школу.

Дык што, справа толькі ў невысокім заробку?

Не будзем спяшацца з высновамі.

Яшчэ адна прычына нізкай матывацыі маладых людзей да педагагічнай прафесіі — адсутнасць кар'ернага росту. Пачынаючы працаваць інжынерам на вытворчасці альбо менеджарам у гандлёвай фірме, мужчыны міжволі мараць пра больш прэстыжныя і фінансава забяспечаныя пасады. А што настаўнік? Да каго, уласна кажучы, ён можа даслужыцца? Да завуча ці дырэктара школы (сярод апошніх, дарэчы, працэнт мужчын значна вышэйшы, чым у цэлым сярод настаўнікаў)? Але ж гэта таксама па вялікім рахунку «тупіковая» пасада. І не вельмі зайздросная, калі шчыра...

І гэта не толькі ў нас.

Калі ўзяць, напрыклад, ЗША, то там, як ні дзіўна, такcама назіраецца падобная карціна. Па звестках Бюро статыстыкі, колькасць мужчын у амерыканскіх школах не так даўно складала ўсяго толькі 24% ад агульнай колькасці настаўнікаў. У некаторых штатах пакасчык быў крыху вышэйшым, дзесьці — яшчэ больш нізкім... І гэта пры тым, што мужчыны-настаўнікі ў сярэднім атрымлівалі ў год каля 45 тысяч долараў. Па нашых мерках — вельмі прыстойны заробак, па амерыканскіх — не. Асабліва для мужчын. І галоўнае — няма перспектыў для кар'ернага росту. А значыць, непрэстыжна для мужчыны-амерыканца быць настаўнікам. Урачом — так! Юрыстам — цудоўна! Бізнесменам... Тут, як атрымаецца, але можна рызыкнуць — раптам пашанцуе?.. А вось настаўнікам... Не прагарыш адназначна, але і не разбагацееш. А гэта неяк не па-амерыканску, бо мара сярэднестатыстычнага амерыканца — «злавіць фартуну за хвост»!

А ў школу фартуна гэта нават носу не кажа, там яе і не ўбачыш, не тое, каб злавіць...

У еўрапейскіх школах, дарэчы, працэнт настаўнікаў-мужчын таксама не вельмі высокі (праўда, у розных краінах свой), так што праблема гэта не толькі наша. Хоць у нас яна ў апошні час асабліва абвастрылася.

Не ідуць мужчыны ў школу, хоць плач! Не хочуць «сеяць разумнае, добрае, вечнае». А тых мужчын, якія сёння ўсё ж гэтым займаюцца, хутка давядзецца ў Чырвоную кнігу заносіць. Як вымiраючы від. Або думаць, як гэты «від» захаваць.

**Генадзь АЎЛАСЕНКА.**

# ЗАПРАШАЕМ РАЗМЯСЦІЦЬ РЭКЛАМУ Ў ГАЗЕЦЕ «ЗВЯЗДА»

**Тэл./факс: (8 017) 287 17 79, 292 04 52. E-mail: reklama@zviazda.by.**


**ОАО «Минский завод отопительного оборудования»**

## ИЗВЕЩАЕТ АКЦИОНЕРОВ О ПРОВЕДЕНИИ ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ,

**которое состоится 25 февраля 2015 года в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Тимирязева, 29 – зал заседаний.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ**
**внеочередного общего собрания акционеров открытого акционерного общества «Минский завод отопительного оборудования» 25 февраля 2015 г.**

1. Об избрании члена Наблюдательного совета
2. Об одобрении внесенных изменений и дополнений в кредитные договоры.

С материалами по вопросам повестки дня акционеры могут ознакомиться по указанному адресу (у председателя наблюдательного совета) **с 13 февраля по 24 февраля 2015 с 10 до 16 часов.**

Регистрация участников собрания будет проводиться с 13.00 до 13.50 в день и по месту проведения собрания **на основании документа, удостоверяющего личность**. Кроме того, представитель акционера должен иметь доверенность (руководитель юридического лица, являющегося акционером, – документы, подтверждающие его полномочия).

Список акционеров для регистрации участников собрания составлен по данным реестра акционеров по состоянию **на 9 февраля 2015**.

*Наблюдательный совет*
*ОАО «Минский завод отопительного оборудования»*

УНП 100008064

**Аукцион по продаже права заключения договора**

## АРЕНДЫ АВТОСТОЯНКИ!

**24 февраля 2015 г. в 14.00**

**по адресу: БелГИСС, ул. Мележа, 3, 220113, г. Минск, комн. 405 состоится аукцион по продаже права на заключение договора аренды автостоянки, расположенной по адресу: Старовиленский тракт, 99, 220053, г. Минск, площадью 1546 кв.м с размещенным на ней двухэтажным капитальным строением площадью 51,0 кв.м.**

Территория автостоянки имеет мелкозернистое асфальтобетонное покрытие, обнесена ж/б плитами высотой 2,13 м с въездными металлическими воротами длиной 4,57 м. На ней расположены двухэтажное здание площадью 51,0 кв.м и навес площадью 131 кв.м.

**Контактные телефоны:** +375 29 147-76-48; +375 25 702-84-23.

УНП 100219737

Утерянный представительством Белгосстраха по Советскому району г. Минска бланк полиса по добровольному страхованию гражданской ответственности владельцев автотранспортных средств формы 2РН, 2РП серии ТС/РБ № 0019751 **считать недействительным.**

УНП 100122726

Утерянный представительством Белгосстраха по Первомайскому району г. Минска бланк страхового полиса по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БЛБ № 0983938 **считать недействительным.**

УНП 100122726

**Октябрьский сельский исполнительный комитет Логойского района Минской области**

## ПРОВОДИТ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ГРАЖДАНАМ ДЛЯ СТРОИТЕЛЬСТВА И ОБСЛУЖИВАНИЯ ОДНОКВАРТИРНЫХ ЖИЛЫХ ДОМОВ

**26 февраля 2015 года в 11.00**

| № лота | Адрес земельного участка | Площадь участка | Возможность подключения к инженерным сетям | Начальная цена, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Расходы по изготовлению документации и проведению аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | д. Городище, участок № 1, кадастровый номер 623285801101000029 | 0,2500 га | Электроснабжение | 10 809 750 | 2 161 950 | 3 132 950 |
| 2 | д. Котели, участок № 1, кадастровый номер 623281704601000022 | 0,2500 га | Электроснабжение, водоснабжение | 12 673 500 | 2 534 700 | 5 915 850 |

Аукцион проводится **26 февраля 2015 года в 11.00** в здании сельисполкома по адресу: Минская область, Логойский район, аг. Октябрь, ул. Центральная, 13. Документы принимаются ежедневно с 8.00 до 17.00, кроме субботы и воскресенья, **до 25 февраля 2015 года.**

*Задаток перечисляется на расчетный счет 3600619131108 в ЦБУ 611 ф-ла № 500 МУ ОАО «АСБ Беларусбанк», код 601, УНН 600181656, код платежа 04901.*

Получатель – Октябрьский сельисполком. Победитель аукциона обязан в течение 10 дней после подписания протокола о результатах проведения аукциона внести плату за земельный участок, код платежа 04901, и оплатить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, код платежа 04616.

**Телефоны для справок: (801774) 72236, 72246, 72235.**
**Эл. адрес: octoblog@mail.ru.**

## РУП «ЖИЛКОММУНТЕХНИКА» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА СП «УНИБЕЛ» ООО ЕДИНЫМ ЛОТОМ

| Номер лота | Предмет торгов | Начальная цена, бел. руб. без НДС | Размер задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| Лот № 1 | 1. *Объекты недвижимости*, расположенные на земельном участке общ. пл. 0,5783 га, с кадастровым номером 121200000001000194, в составе:<br>Изолированное помещение (инв. № 100/D-87539) – административное помещение, общ. пл. 393,7 м²;<br>Изолированное помещение (инв. № 100/D-87540) – административное помещение, общ. пл. 7,4 м²;<br>Изолированное помещение (инв. № 100/D-87541) – производственное помещение, общ. пл. 642,4 м²;<br>Изолированное помещение (инв. № 100/D-87542) – производственное помещение, общ. пл. 15,8 м²;<br>Сети водопроводные (инв. № 000048);<br>Сети канализационные (инв. № 000047).<br>2. *Имущество и оборудование*, в составе:<br>Вентиляционная система (инв. № 000046); котельная установка № 1 (инв. № 000065); котельная установка № 2 (инв. № 000066); котельная установка № 3 (инв. № 000067); котельная установка № 4 (инв. № 000068); сушильный шкаф UZ-108 (инв. №: 000013); блок контроля герметичности PVS 504 (инв. №: 000071); блок контроля герметичности PVS 504, инв. №: 000072; весы электронные ВН-15, (инв. №: 000012); группа для нагревания и охлаждения, (инв. №: 000040); дозатор весовой РТ-ДВ-01, 9 (инв. № 00006); емкость из нержавеющей стали 0,4 м³ (инв. №: 000064); загрузочное устройство с бункером для муки (инв. №: 000051); измерительный комплекс СГ-Эк-Вз-25/1,6, (инв. №: 000065); компрессор промывной, (инв. №: 000011); компрессор «Elektra beckum lt-100», (инв. № 000023); компрессор СБ4/С-100.АВ510В, (инв. №: 000073); компьютер, (инв. №: 000030); компьютер Formoza (системный блок) (инв. №: 000031); ленточный элеватор, (инв. №: 000052); матрица бронзовая к прессу МАК 100, (инв. №: 000044); матрица к аппарату по пр-ву макарон, (инв. №: 000016); матрица тефлоновая, (инв. №: 000053); матрица тефлоновая, (инв. №: 000054); матрица тефлоновая, инв. №: 000055; матрица тефлоновая, инв. №: 000056; машина д/пр-ва макаронных изделий «МАС-100», инв. №: 000024; машина д/пр-ва макаронных изделий МАС-100 VR, инв. №: 000027; машина для производства гнезд, включая раскаточную, инв. №: 000057; машина упаковочная «Twin-2000», инв. №: 000025; машина упаковочная РТ-УМ-01П, инв. №: 000070; принтер НР 1010 (RU), инв. №: 000033; монитор LG Flatron 773E (RU), инв. №: 000032; предварительная сушка, инв. №: 00005; преобразователь частоты LENZE ESMD752L4TXA, инв. №: 000059; пресс К300, инв. №: 000050; принтер ZEBRA 4M+203 DP с намотчиком Labelmate MS, инв. №: 000041; принтер НР 1010, инв. №: 000037; ПЭВМ «Пилот» Core i3-2120, инв. №: 000893; система видеонаблюдения, инв. №: 000074; сканер Bear Paw 2400 CU + (Ger), инв. №: 000034; склеивающий аппарат РТ- УМ-01, инв. №: 000008; сушильный шкаф UZ-108, инв. №: 000003; сушильный шкаф UZ-108, инв. №: 000009; сушильный шкаф UZ-108, инв. №: 000022; сушильный шкаф UZ-108, инв. №: 000028; сушильный шкаф ЕС-150 без тележек и сит, инв. №: 000060; сушильный шкаф ЕС-150 без тележек и сит, инв. №: 000061; сушильный шкаф ЕС-150 без тележек и сит, инв. №: 000062; сушильный шкаф ЕС-150 без тележек и сит, инв. №: 000063 | 5 143 970 000 | 514 397 000 |

| | |
|---|---|
| **Местонахождение объекта** | Брестская обл., г. Брест, ул. Писателя Смирнова, 151 |
| **Характеристики земельного участка** | Земельный участок выделен для строительства производственно-административного корпуса по выпуску макаронных изделий с собственной котельной на природном газе. Права на земельный участок – право аренды. |
| **Условия продажи** | Без условий |
| **Продавец (Балансодержатель)** | СП «Унибел» ООО |
| **Организатор торгов** | РУП «Жилкоммунтехника» Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» Брестское областное управление |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | В течение 20-и рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона |
| **Условия оплаты** | В соответствии с заключенным договором купли-продажи |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | р/с 3012105618108 руб. РБ в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» по г. Минску, код 153001369, УНП 102353509 |

**Аукцион состоится <u>11 февраля 2015 г. в 11.00</u> по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325, Филиал «Центр «Белтехинвентаризация».**
**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, каб. 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00.**
**<u>Последний день приема заявлений</u> – 10 февраля 2015 г. до 17.00.**
**Контактные телефоны организатора аукционных торгов: 8-(0162)- 23-92-59, 21-88-80.**
**Перечень документов, необходимых для участия в аукционных торгах, перечислен в объявлении, опубликованном в газете «Звязда» от 21.11.2014 года.**

## ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

### на право заключения договоров аренды земельного участка для строительства и обслуживания торгово-развлекательного центра в северо-западном районе г. Смолевичи Минской области

| | | |
|---|---|---|
| 1 | **Форма проведения аукциона** | Открытый |
| 2 | **Дата, время и место проведения аукциона** | г. Смолевичи, ул. Советская, 125. Смолевичский райисполком, зал заседаний, 05.03.2015 г. в 11.00 |
| 3 | **Продавец и его адрес** | г. Смолевичи, ул. Советская, 125, Смолевичский райисполком |
| 4 | **Земельный участок, его кадастровый номер и адрес** | Лот № 1 – площадь 1,4947 га, кадастровый номер 624850100005000761, северо-западный район г. Смолевичи Минской области |
| 5 | **Условия продажи** | Без изменения целевого назначения |
| 6 | **Целевое назначение земельного участка** | Лот № 1 – для строительства и обслуживания торгово-развлекательного центра |
| 7 | **Сроки аренды** | Лот № 1 – 99 (девяноста девять) лет |
| 8 | **Сроки заключения договора аренды** | После оплаты стоимости предмета аукциона в течение 2 рабочих дней |
| 9 | **Начальная (стартовая) цена продажи** | Лот № 1 – 2 000 000 000 рублей |
| 10 | **Условия аукциона** | продажа по цене не ниже начальной;<br>участниками аукциона могут быть индивидуальные предприниматели, юридические лица;<br>возместить в установленном порядке затраты на проведение аукциона;<br>убытки открытому акционерному обществу «Смолевичи Бройлер» в сумме 11 968,715 тыс. рублей;<br>потери сельскохозяйственного производства в сумме 419 408,800 тыс. рублей, вызванные изъятием 1,4947 га сельскохозяйственных земель;<br>проектом торгово-развлекательного центра предусмотреть встроенное помещение автостанции с пятью платформами для прибытия отправления маршрутных транспортных средств |
| 11 | **Наличие инженерной инфраструктуры** | Лот № 1 – электроснабжение, газоснабжение, водоснабжение |
| 12 | **Условия оплаты** | За безналичный расчет в течение 10-ти рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона |
| 13 | **Сумма задатка и реквизиты продавца** | *10% от начальной (стартовой) цены продажи р/с 3641000000205 ЦБУ 621 филиала № 616 АСБ «Беларусбанк», г. Жодино, код 812, УНП 600014139, ОКПУ 04064735, назначение платежа 04002.* |

**Затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе изготовление землеустроительного дела, осуществление государственной регистрации создания земельного участка, публикация информационного сообщения, изготовление градостроительного паспорта подлежат возмещению победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона.**

**Порядок предварительного ознакомления в натуре с продаваемым земельным участком – каждый четверг с 9.00 до 13.00.**

**Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами принимаются ежедневно в рабочие дни по адресу: г. Смолевичи, ул. Подлесная, д. 11, каб. № 8.**

**Окончательный срок приема заявлений – 27.02.2015 г. в 17.00.**

**Контактный телефон (8-01776) 55 3 42.**

**Для участия в аукционе в адрес продавца необходимо представить:**

- заявление на участие в аукционе;
- документ, подтверждающий внесение суммы задатка на текущий расчетный счет, указанный в извещении, с отметкой банка;
- индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;
- представителем индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;
- представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;
- представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;
- представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе индивидуальные предприниматели и юридические лица, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

**Неявка участника аукциона на аукцион признается отказом в его участии.**

Утерянные страховые свидетельства «Добровольного страхования ответственности перевозчика», серии ТС формы 2РПП в количестве 8 штук № 0013001, № 0013005, № 0013006, № 0013007, № 0013008, № 0013009, № 0013010, № 0013011по филиалу Минской области **считать недействительными.**

УНП 600013344

■ Меркаванне

# «КУЛЬТУРА — НАШ ГАЛОЎНЫ ПАЛІТЫК»

**Лічыць начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Магілёўскага аблвыканкама Анатоль СІНКАВЕЦ.**



— Мінулы Год гасціннасці быў шчодрым на падзеі, — расказаў нашай газеце Анатоль Анатольевіч. — Мы, напэўна, яшчэ не адышлі ад статусу культурнай сталіцы, ганаровае званне якой насілі пазалетась. Адбылося шмат канцэртаў, фестываляў, выстаў. Прыемна, што культура адыграла вялікую ролю ў эканамічным плане. Вельмі шмат інвестараў прыйшло менавіта таму, што Магілёў меў статус культурнай сталіцы.

***— А якія планы на сёлетні Год моладзі?***

— Будзем працягваць тыя акцыі, якія пачыналі летась. Пакуль яны праводзяцца ад выпадку да выпадку. На базе абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці і культурна-асветніцкай працы мы ствараем маладзёжны цэнтр, куды кожны юнак ці дзяўчына зможа прыйсці са сваімі наватарскімі думкамі. Пры БРСМ створаны савет, які будзе спрыяць развіццю творчых пачаткаў нашых талентаў. Акцэнт таксама ставіцца на развіццё руху студэнцкіх атрадаў. Ужо ёсць каля 5 тысяч ахвотнікаў прыняць удзел. Ёсць задумка, што моладзь дапаможа якой-небудзь арганізацыі.

Наогул наступны год будзе насычаны на культурныя падзеі — гэта фэст «Александрыя збірае сяброў», тэатральны форум «М.@рт.кантакт», фестываль класічнай музыкі «Магутны Божа»; з лютага пачнуцца канцэрты «Залатога шлягера».

***— На рэспубліканскім узроўні нядаўна разглядалася канцэпцыя правядзення купальскага фэсту ў Александрыі. Што чакаць цікавага?***

— Асобых заўваг па нашай канцэпцыі не было. Акцэнт зноў-такі зроблены на моладзь. Збіраемся паказаць наш валанцёрскі рух, як ён працуе з іншымі краінамі. Запросім у госці расіян, украінцаў. Летась вялікі поспех мела пляцоўка ад праекта «Бард-рыбалка», яна будзе працаваць і сёлета. Больш цікавай стане выстава дасягненняў жывёлагадоўлі, арганізатарам якой з'яўляецца абласны Камітэт па сельскай гаспадарцы і харчаванні. Плануем зрабіць праграму выставы больш відовішчнай, арганізаваць гусіныя і парасячыя гонкі. Актыўны ўдзел прымуць навучальныя ўстановы, шырэй будзе прадстаўлена іх сувенірная прадукцыя. Будуць працаваць малая і вялікая музычныя пляцоўкі. Плануем паставіць мюзікл. Гэтым зараз займаецца тэлеканал АНТ. На другі дзень свята па традыцыі адбудзецца ўшанаванне перадавікоў сельскай гаспадаркі і канцэрт з удзелам «зорак» эстрады. Будуць працаваць падвор'і, рамеснікі і народныя майстры. Гандаль плануе пашырыць колькасць пасадачных месцаў у выязных кавярнях да 5 тысяч. Увесь фэст будзе прасякнуты тэмай Купалля. Гэта асноўны стрыжань, на якім ён трымаецца.

***— Што б вы параілі наведаць на Магілёўшчыне замежным гасцям?***

— Любы раённы цэнтр можа нешта паказаць, у кожным свая «разыначка». Для мяне, напрыклад, цікавы Мсціслаў, там шмат чаго можна паглядзець. Жамчужына Кіраўскага раёна — палацава-паркавы ансамбль Булгакаў у Жылічах. Спадзяюся, што да 2016 года там цалкам завершацца рамонтныя работы. У Крычаве можна наведаць палац князя Пацёмкіна. На Касцюкоўшчыне на высокім узроўні праводзіцца свята паэзіі і аўтарскай песні «Пісьмянкоў луг». У Краснаполлі працуе цікавы народны тэатр, якому летась споўнілася 100 гадоў. Ён пастаянны ўдзельнік фестывалю нацыянальнай драматургіі імя Дуніна-Марцінкевіча. Чэрыкаў — край крыніц, дзе захоўваюцца старадаўнія традыцыі і абрады. Асіповічы асацыююцца з паляваннем. У Клічава багатая гісторыя і таксама існуюць усе ўмовы для палявання. Там вельмі любяць адпачываць замежныя турысты. У Слаўгарадзе вядомая далёка за межамі краіны Блакітная крыніца. А які там ладзяць фестываль сыру! Наогул, калі ў раёне ёсць гаспадар, ён можа зрабіць яго прывабным для іншых. У нас добрая прырода, маляўнічыя мясціны. Калі прыязджаюць сябры з далёкага замежжа, мне не прыходзіцца ламаць галаву, што ім паказаць.



Я нядаўна быў на навуковай канферэнцыі ў Кіеве «Культура Еўрасаюза, фінансы і ўсходняе партнёрства». Калі рыхтаваўся да выступлення, мяне папярэдзілі, што аўдыторыя будзе складаная. Але чаго мне хвалявацца, калі нашы фестывалі, а іх у вобласці каля 100, на 60% наведваюць жыхары замежных краін. Культура сёння — самы вялікі палітык у зносінах і сяброўстве. Напрыклад, у апошнім нашым міжнародным фестывалі народнай творчасці «Вянок дружбы» ў Бабруйску прымалі ўдзел 15 краін. А прадстаўніца Вялікабрытаніі, якая прыехала на фестываль па кераміцы «Арт-Жыжаль», здзівілася, што дагэтуль нічога не ведала пра нашу краіну. Яна пакідала нас са словамі ўдзячнасці і надзеяй зноў вярнуцца.

**Нэлі ЗІГУЛЯ**

■

■ Гістарычны ўнікат

# РЫЖСКІ МІР: БЕЛАРУСКІ ПОГЛЯД

**Тэма, якая некаторы час замоўчвалася і была незаслужана адсунута ўбок, нарэшце, у поўнай меры адлюстравана ў двухтомным даследаванні. Ажно 17 аўтараў далучылася да вялікай справы, у выніку якой выйшла калектыўная манаграфія «Рыжскі мір у лёсе беларускага народа». Вучоныя Нацыянальнай акадэміі навук, гісторыкі беларускіх ВНУ і супрацоўнікі Інстытута нацыянальнай бяспекі разважаюць пра сутнасць і значэнне Рыжскага мірнага дагавора для краіны, апісваюць падзеі, што яму папярэднічалі, прыводзяць малавядомыя, але вельмі цікавыя факты.**

— Трэба прызнаць, што сёння ёсць пэўны інфармацыйны голад, які тычыцца погляду айчынных гісторыкаў на тыя ці іншыя праблемы, — лічыць **адзін з аўтараў манаграфіі, дырэктар Інстытута гісторыі НАН Беларусі Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ.** — І, відавочна, наспела неабходнасць весці размову пра знакавыя ў нашай гісторыі падзеі з беларускага пункту гледжання. Гаворачы аб актуальнасці падобных даследаванняў, мы выдатна ўсведамляем, што нам (у першую чаргу гісторыкам) неабходна займаць сваю нішу і ў плане геапалітычных даследаванняў. Менавіта з гэтай мэтай мы стварылі ў інстытуце Цэнтр гісторыі геапалітыкі (упершыню ў айчыннай гістарычнай навуцы). Дарэчы, яго супрацоўнікі таксама прымалі ўдзел у падрыхтоўцы гэтага выдання.



Грунтоўная гістарыяграфія праблемы распачынае першы том манаграфіі. Падзеі польска-савецкай вайны, што папярэднічалі заключэнню Рыжскага мірнага дагавора, сам дагавор, якім чынам адбывалася яго падпісанне, чаму не быў прадстаўлены на гэтых перамовах беларускі бок — на ўсе пытанні ў гісторыкаў ёсць адказы. Падрабязна разглядаецца сацыяльна-эканамічнае, грамадска-палітычнае і духоўна-культурнае становішча на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Другі том вяртае ў падзеі Другой сусветнай вайны, чытачы бачым становяцца сведкамі знакавай даты — уз'яднання Заходняй Беларусі з БССР, сацыяльна-культурных, грамадскіх, палітычных і канфесійных пераўтварэнняў, якія адбываліся на далучаных тэрыторыях, а таксама падзей Вялікай Айчыннай вайны і пасляваеннага становішча ў заходніх рэгіёнах БССР.




**Выдадзена ў Выдавецкім доме «Звязда».**

Вось, напрыклад, вытрымка з дакументальных запісаў 1919 года, што сведчыць пра тую палітыку, якую праводзілі польскія войскі, калі занялі тэрыторыю Беларусі падчас польска-савецкай вайны: «Пры ўваходзе ў Ваўкавыск было загадана спыніць афіцыйны зварот да ўлад на беларускай, рускай і іншых мовах, акрамя польскай. Загадана было зняць усе шыльды на рускай і беларускай мовах, замяніць іх польскімі. Затым прыступілі да вышуку ўсіх беларускіх палітычных і грамадскіх дзеячаў. І неўзабаве ўсе праваслаўныя былі арыштаваны і пасаджаны ў турму... Для апраўдання арыштаў прымусілі ўсіх пад страхам прыстаўленага да скроні рэвальвера даць падпіску ў тым, што яны бальшавікі...» А гэта погляд збоку (з дакладной запіскі пасла Францыі ў Польшчы): «Працягвае ажыццяўляцца палітыка паланізацыі беларускага насельніцтва, у асноўным каталіцкага. Вельмі жорсткая пазіцыя ўрада ў дачыненні да беларускіх інтэлектуалаў, не цярпіць ніякай палітычнай актыўнасці з іх боку, а мясцовай адміністрацыі не дазволена рабіць паслабленняў...»

Аўтары манаграфіі прапаноўваюць паглядзець на некаторыя гістарычныя рэаліі па-новаму. Напрыклад, красамоўная дэталь, што сведчыць пра пазіцыю ўрада БНР, які ў той час узначальваў В. Ластоўскі. З ліста першага наркама па замежных справах СССР Г. Чычэрына: «У інтарэсах спрыяльнага зыходу плебісцытаў літоўскі ўрад увайшоў у пагадненне з урадам БНР лістом ад 20 снежня (1920 года. — **Аўт.**). Ластоўскі заявіў, што да Савецкай Беларускай Рэспублікі яго ўрад хоча захаваць сяброўскія адносіны». Ці не цікавы момант? Атрымліваецца, што фактычна ўрад БНР прызнаваў савецкі ўрад Беларусі і быў гатовы захоўваць сяброўскія адносіны.

**Рыжскаму міру не вельмі пашчасціла, бо ён заўсёды знаходзіўся дзесьці ў цені.**

Не сакрэт, што існаванню беларускай мовы мы абавязаны простаму народу, які насуперак усялякім забаронам, магчыма, толькі ў межах сваёй хаты або на полі, але размаўляў на роднай мове. І ёсць гэтаму дакументальнае пацвярджэнне. «Сяляне размаўляюць на сапраўднай беларускай мове. Прычым ужываюць шмат слоў, аб якіх нас тут запэўнівалі, што яны нацдэмаўскія і выдуманыя...» (з ліста першага сакратара ЦК КПБ П. Панамарэнкі І. Сталіну пра становішча ў Заходняй Беларусі, 25 верасня 1939 года).

На думку **аднаго з аўтараў манаграфіі, загадчыка аддзела навейшай гісторыі Беларусі Інстытута гісторыі Сяргея ТРАЦЦЯКА**, рыжскаму міру не вельмі пашчасціла, бо ён заўсёды знаходзіўся дзесьці ў цені. «У 1920 — 1930-я гады ў Савецкім Саюзе пра яго не ўспаміналі, — гаворыць кандыдат гістарычных навук. — Больш за тое, яго спрабавалі паказаць як перамогу савецкай палітыкі і дыпламаты ваеннага мастацтва. Пасля 1945 года гэтую падзею імкнуліся не ўзгадваць, бо Польшча стала сябрам і саюзнікам. І толькі ў 1990-я гады атрымалася так, што мірны дагавор, заключаны ў Рызе ў 1921 годзе, зноў становіцца актуальнай з'явай палітычнага жыцця. Урэшце менавіта дэнансацыя Рыжскага міру і нацыянальнае ўз'яднанне Беларусі, якое адбылося ў верасні — лістападзе 1939 года, зрабілі нашу краіну такой, якой яна з'яўляецца — моцнай дзяржавай Цэнтральнай Еўропы. Нацыянальнае адзінства ўмацавала беларусаў як адзін з трох вялікіх народаў, на якіх трымаўся ўвесь Савецкі Саюз».

— Усё, што мы маем сёння, — дасягненне беларускага народа, што здолеў выстаяць і захавацца ў самыя цяжкія часы нашай гісторыі, — пераканаНЫ Вячаслаў Даніловіч. — Мы знаходзімся на геапалітычным перакрыжаванні: паміж заходняй і ўсходняй цывілізацыямі. Таму ўвесь час адчуваем, як адбіваўся на нас ціск іншых народаў. Шматлікія войны праходзілі праз нашу тэрыторыю, але беларускі народ аказаўся настолькі жыццяздольным, што захаваў сваю адметнасць, характэрныя толькі для яго рысы. Зразумела, ён убраў нешта і ад сваіх суседзяў, але не растварыўся ў іх. І гэта стала магчымым дзякуючы стойкасці і моцы духу нашых продкаў.

Цікавая структура самога выдання: аналітычны матэрыял кожнага раздзела падмацоўваецца ілюстрацыямі, найбольш знакавымі з гістарычнага пункту гледжання архіўнымі дакументамі па гэтай праблематыцы. Тут прадстаўлены не толькі дакументы беларускіх архіваў, але і Дзяржаўнага архіва Расійскай Федэрацыі, Расійскага дзяржаўнага архіва сацыяльна-палітычнай гісторыі, Польскага архіва новых актаў і іншых. Выданне наўмысна падрыхтавана на рускай мове дзеля прыцягнення больш шырокай аўдыторыі, у тым ліку за мяжой. А там, як прызналіся аўтары, цікавасць да твора ўжо ёсць.

**Вераніка КАНЮТА**

■

■ Online

# КАРАЛЕВА ЗА МАНІТОРАМ

## Беларускія інтэрнэтчыкі выберуць самую прыгожую дзяўчыну

**У трэці раз у нашай краіне пройдзе анлайн-конкурс прыгажосці «Міс Байнэт», да ўдзелу ў якім арганізатары запрашаюць усіх ахвотных дзяўчат з розных рэгіёнаў Беларусі. З галоўных патрабаванняў — толькі два: узрост большы за 18 гадоў і наяўнасць беларускага грамадзянства, ну а адметная знешнасць і ўпэўненасць ва ўласных сілах, відаць, павінна быць апрыёры.**



Фота БЕЛТА.

**Першай «Міс Байнэт» у 2011 годзе стала палачанка Марыя, якой у якасці галоўнага прыза дастаўся тур у Венецыю.**

Як падкрэсліваюць арганізатары, сваёй задачай яны лічаць не столькі выбар і ўшанаванне самых прыгожых беларусак, колькі наогул прапаганду сучаснага эталону прыгажосці сярод моладзі. У палажэнні прапісана, што прэтэндэнткі на віртуальную карону і матэрыяльны галоўны прыз конкурсу мусяць быць не толькі прывабнымі, але і «актыўнымі, адукаванымі, духоўна развітымі, рознабаковымі асобамі, арыентаванымі на поспех у прафесійнай дзейнасці і асабістым жыцці», а таксама на здаровы лад жыцця.

«Упэўніваю конкурс будзе праходзіць у гадавым фармаце, што дазволіць узяць удзел у адборачных турах як мага большай колькасці дзяўчат», — адзначае менеджар праекта Людміла Палаўнёва.

З 20 студзеня адкрыты прыём заявак ад удзельніц, аднак само галасаванне пачнецца толькі 1 сакавіка і будзе адбывацца паэтапна: за тых дзяўчат, хто зарэгіструецца ў сістэме пасля 25 чысла бягучага месяца, прагаласаваць можна будзе цягам усяго наступнага. З 10 лідарау інтэрактыўным галасаваннем карыстальнікі выберуць «Міс месяца», якая будзе адзначана памятным падарункам ад арганізатараў і зможа працягнуць далейшую барацьбу за самы галоўны тытул. Рэгістравацца ў якасці ўдзельніцы можна будзе хоць кожны месяц, але ў фінале залічаць максімальныя балы толькі за адзін з іх. Прычым падтрымаць сваіх фаварытак беларускія інтэрнэт-карыстальнікі могуць не толькі на афіцыйным сайце конкурсу missbynet.by, але і на іншых вядучых інфармацыйных і забаўляльных парталах, а таксама праз СМС-паведамленні. Па выніках 9 месяцаў 20 кандыдатак, якія набяруць найбольшую колькасць балаў, трапяць у фінал «Міс Байнэт».

Тая з удзельніц, хто набярэ найбольшую колькасць балаў у інтэрнэт-галасаванні (а «накруціць» галасы, папярэджваюць арганізатары конкурсу, тут не атрымаецца — за гэтым будуць пільна сачыць вопытныя праграмісты) і заваюе сімпатыю пераважнай колькасці інтэрнэт-карыстальнікаў і суддзяў у фінале, будзе абвешчана пераможцай, а ўладальніцы тытулаў «1-я Віцэ-міс» і «2-я Віцэ-міс», а таксама «Міс глядацкіх сімпатый» атрымаюць каштоўныя падарункі. Праўда, што за галоўны і дадатковыя прызы дастануцца дзяўчатам, пакуль трымаецца ў сакрэце.

**Вікторыя ЗАХАРАВА**

# СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 9.11 | 17.33 | 8.22 |
| Віцебск — | 9.06 | 17.16 | 8.10 |
| Магілёў — | 9.01 | 17.23 | 8.22 |
| Гомель — | 8.51 | 17.26 | 8.35 |
| Гродна — | 9.25 | 17.49 | 8.24 |
| Брэст — | 9.19 | 17.56 | 8.37 |

**Месяц**

*Маладзік 20 студзеня. Месяц у сузор'і Рыб.*

**Імяніны**

*Пр. Анатоля, Паўла, Рыгора. К. Марыі, Раўманда, Яна.*



Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

# ЗАЎТРА







**Якая шыпшына не марыць пра шчаснае лета...**
**Гэта.**
**Ці так, што зрабіў яе Снежань сваёю царэўнай?**
**Пэўна.**
**А што ён забраў у шыпшыны на тым белым полі?**
**Волю.**
**Навошта яна у халоднай вязніцы трывае?**
**Кахае...**

# З КАМП'ЮТАРАМ НА «ТЫ»

**35 жыхароў Дзятлаўшчыны ўжо запісаліся на камп'ютарныя курсы для пажылых людзей, якія пры падтрымцы райвыканкама арганізаваны на базе навучальных устаноў.**

Групы сфарміравалі з улікам узроўню валодання камп'ютарам — для навічкоў і тых, хто ўжо валодае нейкімі азамі. Пенсіянераў навучаць апрацоўваць на камп'ютары графічную і тэкставую інфармацыю, працаваць з рознымі інтэрнэт-браўзерамі, карыстацца электроннай поштай, скайпам, сацыяльнымі сеткамі, інтэрнэт-банкінгам, пазнаёмяць з нацыянальнымі інфармацыйнымі рэсурсамі. Дарэчы, сярод курсантаў ёсць і сямейныя пары.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

**Светлага шчасця і даўгалецця!**

Шаноўны **Канстанцін Андрэевіч СУМАР**!

Віншуем з прыемнай падзеяй у Вашым жыцці — узнагароджаннем Граматай Брэсцкага абласнога выканаўчага камітэта. Вы атрымалі яе за шматгадовую плённую працу ў органах выканаўчай улады і значны асабісты ўклад у эканамічнае, сацыяльнае і культурнае развіццё Брэсцкай вобласці. Ведаем Вас і як нястомнага члена Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

Кіраўнікі-аграрнікі, усе хлебаробы нашага Пінскага Палесся жадаюць Вам моцнага здароўя, новых здзяйсненняў у жыцці, светлага сямейнага шчасця і даўгалецця.



**Аляксандр АНДРЫЕВІЧ,**
**старшыня Пінскага райаграпрамсаюза.**

УНП 201016437

Даты | Падзеі | Людзі

**23 СТУДЗЕНЯ**

**1863** год — у Варшаве пачалося паўстанне за аднаўленне Рэчы Паспалітай у межах 1772 года. Падрыхтавана яно было польскімі, беларуска-літоўскімі канспіратыўнымі арганізацыямі сумесна з расійскімі рэвалюцыянерамі-дэмакратамі з арганізацыі "Зямля і воля". Паўстанне было задушана ў 1864 годзе, яго ўдзельнікі жорстка пакараны.

**1940** год — 75 гадоў таму нарадзіўся (вёска Красыні Лёзненскага раёна) Мікалай Аляксеевіч Ізобаў, беларускі вучоны, доктар фізіка-матэматычных навук (1979), прафесар (1990), акадэмік НАН Беларусі (1994). Аўтар больш за 200 навуковых прац. Даследаванні па звычайных дыферэнцыяльных ураўненнях, у прыватнасці па тэорыі характарыстычных паказчыкаў Ляпунова і тэорыі ўстойлівасці. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (2000).

**1960** год — адбылося першае апусканне чалавека на дно Марыянскай упадзіны — самую загадкавую і недаступную частку нашай планеты. Марыянская ўпадзіна — найглыбейшае месца ў сусветным акіяне і адначасова найглыбейшая ўпадзіна ў зямной кары. Яна размешчана паміж Японіяй і Папуа — Новай Гвінеяй паблізу ўсходняй часткі Паўночных Марыянскіх астравоў. Яе даўжыня — 2926 кіламетраў, глыбіня — 11 кіламетраў, а шырыня — 80 кіламетраў. Адзінае апусканне на дно ўпадзіны ажыццявілі 23 студзеня 1960 года амерыканцы — лейтэнант Дон Уолш і даследчык Жак Пікар на батыскафе «Трыест». Прыборы апарата зафіксавалі рэкордную глыбіню — 10918 метраў. У 1997 і 2009 гадах былі ажыццёўлены яшчэ два апусканні, але на гэты раз з дапамогай аўтаматычных падводных апаратаў «Kaiko» і «Nereus».



**Было сказана**

**Рыгор БАРАДУЛІН,**
**народны паэт Беларусі:**

*Няма народаў малых —*
*Бываюць малыя паэты.*
*Паэт — неспакою слых:*
*Ён чуе травінкі ўскалых*
*І грукат сэрца планеты.*

# УСМІХНЕМСЯ

Добры спецыяліст валяецца на дарозе толькі ў дзень палучкі.

**— Тата, калі ты ўжо вынеш з лоджыі гэтыя старадаўнія санкі?**
**— Гэта легендарныя санкі, дачушка! Раніцай я цягне на іх у садок вазіў, а ўвечары мяне на іх мамка з гаража забірала.**

— Як маецца твой цесць?
— Не пытайся...
— Што, захварэў?
— Горш.
— Памёр?
— Горш. Ён змяніў пол — і зараз у мяне дзве цешчы...

**Разумны смартфон, узяты сям'ёй за мяжу, за паўгадзіны «з'еў» кошт паловы пуцёўкі, запампаваўшы абнаўленні.**

Адэса. Аб'ява:
«Паважаныя жыхары! Майце сумленне, выкідвайце смецце ў суседні двор!»



caricatura.ru

**НАРОДЖАНЫЯ 23 студзеня**

**Унікальнасць і арыгінальнасць характару — іх галоўная рыса. Пры ўсёй эксцэнтрычнасці і дзівацкасці гэтыя людзі з'яўляюцца ўвасабленнем цвёрдасці, пастаянна імкнуцца да павышэння сваёй самаацэнкі, гатовы да самаахвяравання, ніколі не ідуць на пагадненні за свой сумленнем, з задавальненнем займаюцца грамадскай дзейнасцю, асабліва калі пры гэтым могуць дапамагчы іншым. Яны з лёгкасцю праходзяць праз усе выпрабаванні, бо сумленнасць, мараль і адказнасць для іх — не проста прыгожыя словы. У іх усё адзначана сваім стылем, і яны гэтым бязмерна задаволены, а для сваіх каханых, калі трэба, яны адчыняць любыя дзверы і дастануць Месяц з нябёсаў.**

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 21.093. Індэкс 63850. Зак. № 287.

Нумар падпісаны ў 19.30 22 студзеня 2015 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12